Бульбазагатоўкі

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарвыкаму Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV № 263 (4168) НЯДЗЕЛЯ, 27 верасьня 1931 г. Выходзіць бесьперапынна.

КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН ЗДАЧЫ БУЛЬБЫ— ДА КОЖНАЙ ВЕСКІ І КАЛГАСУ!

Неадкладна спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак

Фарсаваць вывазку бульбы з глыбінных пунктаў на чыгуначныя станцыі

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ СЕННА

КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК за апошні перыяд праробіла вялізарнейшую работу па перабудове рабселькораўскага руху і ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва ім, на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка г. г.

Цэнтральная кіраўнічая рабселькораўская часопісь «Рабкрестькор» (выданьне «Правды»), прысьвяціўшы вопыту Беларусі па перабудове рабселькораўскага руху спэцыяльны нумар (№ 23) часопісі, у перадавым артыкуле «РАЎНЯЦЦА ПА БЕЛАРУСІ», даючы аналіз становішчу рабселькораўскага руху БССР, падкрэсьліла, што

«найбольш характэрным у тых буйнейшых зрухах, якія адбыліся ў Беларусі перад і пасьля другога ўсебеларускага зьезду... перш за ўсё —значнае, усё ўзрастаючае павышэньне партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі. Імення гэта зьяўляецца асноўным і галоўным у тым пераломе, які мы наглядаем у Беларусі пры азнаямленьні з разьвіцьцём руху».

Гэтых дасягненьняў дабілася КП(б)Б у рашучай барацьбе з праваапартуністычнай недаацэнкай ролі і месца нізавога друку і рабселькораў у разгорнутым сацыялістычным наступленьні.

Руйнуючы адпор атрымалі апартуністы, якія ігнаруючы паказаньні ЦК УсеКП(б), аб тым, што «РАБСЕЛЬКОРЫ СТАНОВЯЦЦА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ АРГАНІЗАТАРАМІ МАС ДЛЯ СПРАВЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, ВЫКАНАНЬНЯ ВЫТВОРЧЫХ ПЛЯНАЎ І РАЗГОРНУТАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ НА КЛЯСАВЫХ ВОРАГАЎ», імкнуліся прынізіць ролю рабселькораў, абмежаваўшы апошніх роляй толькі інфарматараў, сыгналізатараў, пасыўна адлюстроўваючых настроі мас.

Пасьля зьезду, рабселькораўскі рух БССР дабіўся новых значных перамог. Досыць адзначыць тую вялікую работу, якую прарабілі, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, сотні ШТОДЗЕННЫХ ПАЛЯВЫХ САЎГАСНЫХ І КАЛГАСНЫХ ГАЗЭТ НА ПАЛЕХ БАЛЬШАВІЦКАЙ УБОРКІ ЎРАДЖАЮ, масавае разгортваньне выданьня на фабрыках і заводах ШТОДЗЕННЫХ ЦЭХАВЫХ, ЗЬМЕННЫХ і БРЫГАДНЫХ ГАЗЭТ «ЗА РАБОТУ ПА НОВАМУ», уцягненьне ў рады рабселькораў НОВЫХ ТЫСЯЧ УДАРНІКАЎ і нарэшце, тую значную ролю, якую адыгралі і адыгрываюць нізавы друк і рабселькоры ў правядзеньні маноўраў РСЧА і СПА.

Гаворачы аб гэтых бясспрэчных вялікіх дасягненьнях трэба адначасова адзначыць, што яшчэ НЯ ЎСЕ партыйныя арганізацыі павярнуліся тварам да выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б аб узмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам, як адным з важнейшых вучасткаў агульна - партыйнай работы.

Сакратарыят ЦК, заслухаўшы на гэтых днях спэцыяльную справаздачу бюро Сеньненскага РК КП(б)Б, адзначыў «НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ СТАНОВІШЧА Ў РАБОЦЕ НІЗАВОГА ДРУКУ, РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ І ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА ІМ У СЕНЬНЕНСКІМ РАЁНЕ».

Бюро Сеньненскага РК яшчэ ў сакавіку прыняў пастанову па дакладу брыгады культпропу—ЦК аб выніках абсьледваньня становішча нізавога друку і рабселькораўскага руху ў Сеньненскім раёне. У гэтай пастанове бюро канстатавала «НАЯЎНАСЬЦЬ ЯЎНАЙ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКІ НІЗАВОГА ДРУКУ І КІРАЎНІЦТВА РАБСЕЛЬКОРАЎСКІМ РУХАМ З БОКУ БОЛЬШАСЬЦІ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК РАЁНУ, У ВЫНІКУ ЧАГО ЁСЬЦЬ АДАРВАНАСЬЦЬ АСОБНЫХ ГАЗЭТ АД МАС, АДСТАВАНЬНЕ АД ТЭМПАЎ СУЧАСНАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА». Бюро дало рад практычных паказаньняў партыйным ячэйкам аб узмацненьні партыйнага кіраўніцтва і разгортваньня рабселькораўскага руху. У той-жа час райком недапушчальна аднёсься да сваёй-жа пастановы, ён палец аб палец ня ўдарыў для таго, каб забясьпечыць рэалізацыю ім-жа вынесеных прапаноў. І ня дзіўна таму, што становішча нізавога друку і рабселькораўскага руху з таго часу НЕ ПАЛЕПШЫЛАСЯ.

На зьмешчаны ў раённай газэце «КАМУНАР» артыкул пад назвай «Рашуча пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай нізавога друку і рабселькораўскага руху» (№ 28 ад 14-VIII), у якім у асноўным правільна паказана аб нездавальняючым становішчы з самакрытыкай і кіраўніцтвам рабселькораўскім рухам у Сеньненскім раёне, райком КП(б)Б замест бальшавіцкага рэагаваньня у сваёй пастанове накіраваў агонь супроць газэты «Камунар», абвінавачваючы апошнюю ў паклёпе на раённае партыйнае кіраўніцтва. Прыняцьцем гэтай пастановы бюро Сеньненскага РК дапусьціла грубую палітычную памылку.

Сеньненскі РК яшчэ да апошняга часу не зразумеў таго, што «нізавым друкам раёну і работай сярод рабселькораў павінны кіраваць райпарткомы, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу парт'ячэйкі і рэдакцыі раённых газэт» (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб сельскім, раённым і нізавым друку). Не зразумеў райком і сутнасьці работы сярод рабселькораў у НОВЫХ умовах, сутнасьці таго, што ЎДАРНАЯ БРЫГАДА ДРУКУ ПАВІННА СТАЦЬ ВЯДУЧЫМ ЗЬВЯНОМ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ, а таму і дае ў сваёй пастанове ўстаноўку... «арганізаваць РАБСЕЛЬКОРАЎСКІЯ ГУРТКІ (?!) пры ўсіх хатах-чытальнях, клюбах і чырвоных кутках калгасаў і саўгасаў».

У дадатак да характарыстыкі становішча кіраўніцтва друкам з боку РК, трэба паказаць на тое, што сама раённая газэта «КАМУНАР», «не перабудаваўшы сваёй апэрацыйна - масавай работы, НЯ БЫЛА арганізатарам мас і ня здолела мабілізаваць іх на выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній» (з пастановы сакратарыяту ЦК).

Між тым, аб гэтым ня раз сыгналізавалі ў сваіх аглядах друку «ЗЬВЯЗДА» і «РАБСЕЛЬКОР», на што ні РК, ні газэта «Камунар» не рэагавалі не скарысталі гэтай крытыкі для зьнішчэньня паказаных у аглядах недахопаў, для рашучай перабудовы сваёй работы.

Зараз бюро Сеньненскага РК свае палітычныя памылкі ПРЫЗНАЎ. У надрукаванай сёньня пастанове сакратарыяту ЦК, даны канкрэтныя паказаньні Сеньненскаму РК па выпраўленьні дапушчаных памылак. Перабудова і разгортваньні рабселькораўскага руху і ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва павінна праходзіць пад кутом выкананьня пастановы ЦК аб тым, што «КОЖНАЯ ЯЧЭЙКА, КОЖНЫ ЧЛЕН ПАРТЫІ НЯСЕ НЕПАСРЭДНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА СТАНОВІШЧА НІЗАВОГА ДРУКУ І РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ».

Урокі Сеньненскага раёну павінны ўлічыць усе партарганізацыі і асабліва ГОРАЦКІ, ЖЫТКАВІЦКІ і ВУШАЦКІЯ раёны, дзе справа са становішчам рабселькораўскага руху не на многа лепш Сеньненскага раёну. Аб гэтым ясна гавораць матар'ялы; надрукаваныя ў апошнім нумары газэты «Рабселькор» (№ 45—ад 25-IX).

Амаль што да ўсіх райкомаў КП(б)Б адносіцца ў першую чаргу паказаньне ЦК аб НЕАДКЛАДНАЙ арганізацыі пастаянных раённых камісій па кіраўніцтве рабселькораўскім рухам і наладжваньні жывога кіраўніцтва з боку партыйных ячэек нізавым друкам.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК дабілася ў справе разгортваньня рабселькораўскага руху значных посьпехаў. У сваім рэдакцыйным артыкуле «Правда» заклікала ўсе партарганізацыі Савецкага Саюзу скарыстаць наш вопыт. Гэта ўсё ўскладае на кожны РК, на кожную партыйную ячэйку, на кожнага члена партыі вялікую адказнасьць за завяршэньне перабудовы, далейшы ўздым рабселькораўскага руху і яшчэ большае павышэньне яго ролі ў разгорнутым сацыялістычным будаўніцтве, у барацьбе за генэральную лінію партыі.

„Манаполія" бялыніцкага райкаапсаюзу

БЯЛЫНІЧЫ.

Бялыніцкі раён павінен загатовіць 10 700 тон бульбы. Раённы цэнтр знаходзіцца ў 45 клм. ад чыгункі. Для пасьпяховага выкананьня пляну неабходна максымальная выразнасьць у рабоце, жывое сыстэматычнае кіраўніцтва загатоўчымі сыстэмамі.

Аднак, замест разгортваньня ўдарных тэмпаў работы, бялыніцкія загатоўцы вялі паміж сабой ведамственыя спрэчкі аб тым, каму і што загатаўляць. Нарэшце, пасьля доўгіх спрэчак, бялыніцкія «мудрэцы» ўстанавілі манаполію ў бульбазагатоўках. Апошнія ўскладзены выключна на райкаапсаюз. Райспажыўсаюзу праводзіць загатоўкі бульбы не дазваляецца.

Між тым, райкаапсаюз зусім не падрыхтаваны да прыёму бульбы і кампанія фактычна асуджана на самацёк. Кулацка-заможныя элементы злосна ігнаруюць здачу бульбы дзяржаве і накіроўваюць яе на прыватны рынак. Райкаапсаюз-жа праходзіць міма гэтага факту і патурае кулацкаму сабатажу.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны неадкладна выправіць дапушчаную памылку, уключыць у бульбазагатоўчую кампанію і сыстэму райспажыўсаюзу, вылучыўшы ёй адпаведную колькасьць сельсаветаў.

Па-ўдарнаму ўзяліся за ўборку

ПОЛАЦК. (Наш кар.).

Калгас «Праца», Варопіцкага сельсавету, павінен убраць 55 гэкт. бульбы. У мінулым годзе калгас з уборкай бульбы ня справіўся. Улічыўшы гэты ўрок, калгас у бягучым годзе па-ўдарнаму распачаў уборку.

Арганізавана 5 брыгад. Вызначаны нормы выпрацоўкі, нарады выпісваюцца за дзень наперад. Нормы выпрацоўкі, дзякуючы ўдарнай рабоце калгасьнікаў, перавыконваюцца.

Вялікую ролю адыгрывае газэта-штодзенка, якая арганізавана раённай газэтай «Чырвоная Полаччына». Яна мабілізуе калгасьнікаў на разгортваньне высокіх тэмпаў уборкі. З 20 верасьня па 10 кастрычніка ў калгасе абвешчан двухдэкаднік уборкі бульбы.

Уборка бульбы ў калгасе ўвязана з зяблівам. Узьнята пад зяблева 50 гэктараў, з іх 6 гэктараў цаліны.

А. ШУСТРЫ

Даць вагоны для адгрузкі бульбы

На станцыях Слуцак, Цераxаўка і Быхава ляжаць 32 вагоны бульбы для Ленінграду

НЕКАТОРЫЯ ТРАНСПАРТНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЗРЫВАЮЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ Ў ЛЕНІНГРАД. НА СТАНЦЫІ СЛУЦАК ЛЯЖАЦЬ БЯЗ РУХУ 20 ВАГОНАЎ, НА СТ. ЦЕРАХАЎКА—10 ВАГОНАЎ, СТ. БЫХАВА—2 ВАГОНЫ БУЛЬБЫ.

УПАЎНАВАЖАНЫ ЕКПІЗ ПАВІНЕН ДАЦЬ ПАКАЗАНЬНІ ЎСІМ ЧЫГУНАЧНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ АБ ПРАДАСТАЎЛЕНЬНІ ВАГОНАЎ ДЛЯ ПЕРАВОЗКІ БУЛЬБЫ Ў ПРАЛЕТАРСКІЯ ЦЭНТРЫ БЯЗ УСЯКАЙ ЧАРГІ І ЛІКВІДАЦЫІ ПРОБАК НА СТАНЦЫЯХ.

Ліквідаваць „пробку" на ст. Цераxаўка

ЦЕРАХОЎКА. 23. (Белта).

Цераxаўскі раён павінен кожны дзень адгружаць па 2 вагоны бульбы. Аднак адгрузка зрываецца з-за непадачы вагонаў чыгункай.

На складах загатоўшчыкаў ляжыць каля 12 вагонаў бульбы, 10 вагонаў гародніны і 25 вагонаў збожжа. Усе складскія памяшканьні перагружаны, атрымалася «пробка». На станцыю Цераxаўка падаецца ў суткі... адзін вагон.

„Вецер сялянскіх паўстаньняў" носіцца па палёх Румыніі

ВЕНА, 24. Лідэр румынскай народнай партыі генэрал АВЭРЭСКУ (былы прэм'ер і былы камандуючы румынскай акупацыйнай арміяй у Бэсарабіі) у сваім органе «Індрэптара» спыняецца НА ПАГРАЖАЮЧЫХ СЯЛЯНСКІХ ПАЎСТАНЬНЯХ У РУМЫНІІ. Авэрэску канстатуе, што зьбядненьне сялянскіх мас хуткімі крокамі вядзе краіну да поўнага развалу асноўнай вытворчасьці г. зн. сельскага гаспадарчую. «Нездавальненьне сялян набывае такія разьмеры, — заяўляе Авэрэску, — якія выклікаюць вялікі непакой». «НА НАШЫХ ПАЛЁХ, — дадае Авэрэску, — НОСІЦЦА ВЕЦЕР ПАЎСТАНЬНЯ. Дзякуючы гэтаму, у нас падрыхтавана глеба для фашызму ўсякага роду, які накіраван супроць «зялёнай дыктатуры», г. зн. супроць паўстаньня сялянства». «Мы павінны, — заканчвае Авэрэску свой артыкул, — згадзіцца з тым, што фашысцкі пераварот у Румыніі стаў неабходным».

Максымальна ўшчыльніць тэрмін загатовак і адгрузкі бульбы

ТЭЛЕГРАМА ЦК КП(б)Б і СНК БССР

УСІМ РАЙКОМАМ І РАЙВЫКАНКОМАМ

РАЗГОРТВАНЬНЕ БУЛЬБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ Ў АПОШНЮЮ ДЭКАДУ СТВАРАЕ ПАГРОЗУ СВАЯЧАСОВАМУ ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНУ, АСАБЛІВА ВЫВАЗУ БУЛЬБЫ У ЛЕНІНГРАД. У РАДЗЕ РАЁНАЎ НЯМА НАЛЕЖНАГА ФАРСАВАНЬНЯ ГЭТАЙ АДКАЗНАЙ СПРАВЫ. КАБ ПАПЯРЭДЗІЦЬ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ ЗАЦЯГВАНЬНЕ ЗАГАТОВАК, ЦК КП(б)Б І СНК БССР ПРАПАНУЮЦЬ:

ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНУЦЬ МАСАВАЕ КАПАНЬНЕ БУЛЬБЫ, ЎЗЯЎШЫ ЗА АСНОВУ ЗДАЧУ БУЛЬБЫ ПА ЗАГАТОЎКАХ АДНААСОБНІКАМІ І КАЛГАСАМІ ЗАРАЗ-ЖА ПАСЬЛЯ КАПАНЬНЯ.

БЕЗАДКЛАДНА АРГАНІЗАВАЦЬ ДАПАМОГУ БУЙНЫМ КАЛГАСАМ РАБОЧАЙ СІЛАЙ, ТРАНСПАРТАМ.

ДАВЕСЬЦІ КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН ЗДАЧЫ БУЛЬБЫ ДА КОЖНАЙ ВЕСКІ І КАЛГАСУ.

ПРЫНЯЦЬ ЗАХАДЫ ДА БЕЗАДКЛАДНАГА СПАГНАНЬНЯ БУЛЬБЫ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК.

ВЫЗНАЧЫЦЬ ПА КОЖНАЙ ВЁСЦЫ, КАЛГАСЕ, СЕЛЬСАВЕЦЕ, ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, АСАБІСТА АДКАЗНЫХ ЧЛЕНАЎ КАЛГАСАЎ, СЕЛЬСАВЕТАЎ, ПРАЎЛЕНЬНЯЎ ЗАГАТОЎЧЫХ СЫСТЭМ ЗА СВАЯЧАСОВУЮ ЎБОРКУ І ЗДАЧУ БУЛЬБЫ.

ЗЬВЯРНУЦЬ УВАГУ НА ЯКАСЬЦЬ ЗДАВАНАЙ БУЛЬБЫ, ДАБІЦЦА ПЕРАБОРКІ ЯЕ НЕПАСРЭДНА Ў ЧАСЕ КАПАНЬНЯ.

РАШУЧА СПЫНІЦЬ МОМАНТЫ АЖЫЯТАЖУ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, РАССТАВІЦЬ СІЛЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ВЫЗНАЧАНЫМІ ПЛЯНАМІ.

БЕЗАДКЛАДНА СКОНЧЫЦЬ АДВОД ЗОН ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ Ў МЕЖАХ ПЛЯНАЎ, СТВАРЫЦЬ УМОВЫ ДЛЯ БЕСЬПЕРАБОЙНАЙ РАБОТЫ ЗАВОДАЎ СВАІМ АПАРАТАМ.

АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ ЗЬВЯРНУЦЬ НА ДАЧУ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ПА ЎСТАНОЎЛЕНЫХ ТЭРМІНАХ.

ЦК КП(б)Б І СНК БССР ПРАПАНУЮЦЬ МАКСЫМАЛЬНА СКАРАЦІЦЬ ТЭРМІН БУЛЬБАЗАГАТОВАК, АСАБЛІВА ВЫВАЗУ, УЛІЧВАЮЧЫ МЭТЭАРАЛЯГІЧНЫЯ ЎМОВЫ, ЯКІЯ ГАВОРАЦЬ АБ РАНЬНІМ НАСТУПЛЕНЬНІ ХАЛАДОЎ. ПАД АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ САКРАТАРА РК І СТАРШЫНІ РВК АБАВЯЗВАЕМ АРГАНІЗАВАЦЬ ВЫВАЗ БУЛЬБЫ Ў ЛЕНІНГРАД РАЗЬЛІКАМ ПОЎНАГА СКАНЧЭНЬНЯ ВЫВАЗУ НЕ ПАЗЬНЕЙ ПЯТНАЦЦАТАГА ЛІСТАПАДА.

АБ ХОДЗЕ РАБОТЫ ІНФАРМУЙЦЕ ЦК І СНК КОЖНУЮ ДЭКАДУ.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.
СТАРШЫНЯ СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Загатоўкі—у цэнтр увагі партарганізацый!

(На нарадзе пры ЦК КП(б)Б)

Тэмпы, якімі зараз разгортваюцца загатоўкі, не забясьпечваюць выкананьня дырэктыў партыі аб тэрмінах здачы таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Так, па збожжу на 1 кастрычніка павінна быць выканана ня менш 50 проц. гадавога заданьня, між тым на 20 верасьня плян збожжазагатовак быў выкананы толькі на 17,3 проц. Значна горш стаіць справа з выкананьнем загатовак па саломе і гародніне.

Улічваючы такое становішча загатовак, ЦК КП(б)Б мабілізаваў 45 асоб з ліку партактыву цэнтральных устаноў і арганізацый у дапамогу райкомам партыі раёнаў, якія адстаюць па правядзеньні гэтай кампаніі.

26 верасьня пры ЦК КП(б)Б адбылася інструкцыйная нарада таварышоў, што выяжджаюць на раёны, на якой выступілі ўпаўнаважаны ЦК УсеКП(б) тав. ЛАЗОЎСКІ і прадстаўнік Наркамснабу БССР тав. КРАСОЎСКІ.

У сваіх прамовах выступаўшыя ахарактарызавалі становішча з выкананьнем плянаў загатовак і намецілі рад практычных мерапрыемстваў, якія павінны быць пакладзены ў аснову работы па рэалізацыі дырэктыў партыі аб загатоўках.

Посьпехі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, вялікія эканамічныя і клясавыя зрухі на вёсцы, а таксама масавая кантрактацыя яравых пасеваў гэтага году стварылі ўсе ўмовы для таго, каб загатоўкі таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі правесьці ў максымальна кароткі тэрмін. Аднак, апартуністычныя адносіны да справы, стаўка на самацёк і адсутнасьць клясавай пільнасьці ў радзе раёнаў паставілі пад пагрозу справу выкананьня дырэктыў партыі на гэтым адказнейшым вучастку работы.

Адной з рашаючых умоў у правядзеньні загатовак зьяўляецца плянавасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва ў гэтай рабоце з боку адпаведных раённых устаноў і арганізацый. Ужо 3-га жніўня пляны загатовак былі пасланы ў раёны, аднак, да гэтага часу ў некаторых раёнах (Рэчыца і інш.) гэтыя пляны не даведзены да паасобных сельсаветаў, вёсак і калгасаў.

У радзе раёнаў асобныя работнікі ня спыняюць гутарак аб нерэальнасьці плянаў, прычым гэтыя спасыланьні ў большасьці выпадкаў імкнуцца апраўдаць неўраджайнасьцю тэй ці іншай культуры. Між тым, праверка паказала, што ўсе гэтыя гутаркі ў пераважнай большасьці раёнаў зусім беспадстаўныя.

ПЛЯНЫ ЗАГАТОВАК МОЖНА І НЕАБХОДНА ВЫКАНАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН.

Асабліва значэньне ў правядзеньні загатовак набывае правільны клясавы падыход пры канчатковым устанаўленьні норм здачы па кантрактацыі і даваньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак. Між тым у радзе раёнаў (Чавускі, Тураўскі, Чачэрскі і інш.) няма патрэбнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія часта сабатуюць выкананьне даных ім цьвёрдых заданьняў. Разам з гэтым у некаторых раёнах (Чэрвеньскі і інш.) правая практыка пераплятаецца з «левацкімі» антысераднядкімі загібамі. Характэрна, што выпраўленьне «левацкіх» памылак, перагляд плянаў даводзеньня цьвёрдых заданьняў праходзіць у асобных мясцох так, што кулак мае магчымасьць збыць свае таварныя лішкі на прыватным рынку.

Надзвычайна дрэнна пастаўлена работа па падрыхтоўцы складаў і абсталяваньня на ссыпных пунктах. ЦК КП(б)Б даў выразныя ўказаньні аб тым, што ссыпныя пункты, як правіла, павінны быць арганізаваны пры чыгуначных і водных шляхах зносін. Аднак, гэта дырэктыва ў радзе раёнаў ігнаруецца. Ёсьць выпадкі, калі пры ўсіх спрыяючых тэрытарыяльных умовах для выкананьня пеманёнай дырэктывы ў некаторых раёнах арганізуюцца па 5-6 глыбінных пунктаў. Вельмі мала аддаецца ўвагі пабудове складаў і іх абсталяваньню і выкарыстоўваньню ўнутраных рэсурсаў.

У радзе калгасаў мы наглядаем спажывецкія настроі, што значна адбіваецца на тэмпах загатовак па сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Нашы саўгасы на 20-га верасьня выканалі плян збожжазагатовак толькі на 4,1 проц. Усё гэта з асаблівай вастрынёй ставіць перад намі пытаньне аб узмацненьні масавай работы. Аднак, у радзе партарганізацый існуюць шкодныя настроі аб тым, што там, дзе цэнтральнай фігурай земляробства зьяўляецца калгасьнік, масавая работа, як сродак сваячасовага выкананьня плянаў загатовак, трациць сваю актуальнасьць. ПАДОБНЫЯ НАСТРОІ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ РАШУЧЫ АДПОР.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на абслугоўваньне масавай работай ссыпных пунктаў.

Трэба адзначыць, што работа загатоўчага апарату ва многіх зьвеньнях прасякнута дзялячтвам, значная частка работнікаў гэтага апарату не надае патрэбнага палітычнага значэньня справе загатовак, не займаецца, як сьлед, арганізацыяй калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас на барацьбу з кулаком. Такое становішча ў значнай ступені тлумачыцца тым, што ў загатоўчым апараце нярэдка знаходзяць сабе прытулак старыя «спэцы» — былыя гандляры, спэкулянты і іншыя варожыя нам элемэнты. Партыйныя арганізацыі на месцах невыстарчальна займаюцца падборам работнікаў загатоўчага апарату і нават у некаторых выпадках лічаць клясава-варожую засьмечанасьць гэтага апарату «нармальным» зьявішчам.

Ня гледзячы на выразныя ўказаньні цэнтральных устаноў аб функцыях паасобных загатоўчых арганізацый, у радзе месц можна заўважыць недапушчальную блытаніну гэтых функцый, што прыводзіць да зьніжэньня тэмпаў загатовак.

Трэба адзначыць, што пытаньню загатовак як з боку раённага, так і цэнтральнага друку аддавалася мала ўвагі. Гэты недахоп у рабоце друку павінен быць неадкладна выпраўлен. Ад'яжджаючыя на раёны павінны сыстэматычна інфармаваць цэнтральны друк аб становішчы разгортваньня работы па загатоўках.

Кожная партыйная арганізацыя, а таксама таварышы, якіх ЦК КП(б)Б камандыруе ў дапамогу райкомам партыі па правядзеньні загатовак, павінны ўлічыць дапушчаныя памылкі і непаладкі ў загатоўчай рабоце і на аснове шырокай масавай работы сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, выклікаць сустрэчныя пляны загатовак, дабіцца сваячасовага выкананьня плянаў здачы таварнай прадукцыі як сацыялістычным, так і аднаасобным сэктарам вёскі.

К—р

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 11-IX-31 году

„Аб становішчы нізавога друку, рабселькораўскага руху і парткіраўніцтва ім у Сеньненскім раёне"

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае нездавальняючае становішча ў рабоце нізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім у Сеньненскім раёне (рад выпадкаў грубага заціску самакрытыкі ў раёне, недапушчальнае становішча насьценных газэт і арганізацыі сталай выхаваўчай работы з рабселькорамі, невыстарчальная барацьба раённай газэты з канкрэтнымі праявамі заціску самакрытыкі, з канкрэтнымі фактамі апартуністычнай недаацэнкі рабселькораўскага руху).

2. Зьмешчаны ў раённай газэце «Камунар» ад 14 жніўня г. г. артыкул («Рашуча пакончыць справу апартуністычнай недаацэнкі нізавога друку і рабселькораўскага руху») у асноўным правільна сыгналізаваў аб нездавальняючым становішчы з самакрытыкай і кіраўніцтвам рабселькораўскім рухам у Сеньненскім раёне.

Сеньненскі РК КП(б)Б замест канцэнтрацыі ўвагі партыйнай арганізацыі на барацьбу за бальшавіцкую самакрытыку і перабудову рабселькораўскага руху, у сваёй пастанове ад 19 жніўня г. г. накіроўваючы агонь супроць газэты «Камунар» і кваліфікуючы вышэйпаказаны артыкул як паклёп на кіраўніцтва раёну, дапусьціў грубую палітычную памылку.

Прыняць да ведама заяву сакратара Сеньненскага РК КП(б)Б т. Алая аб тым, што бюро РК на пленуме РК прызнала дапушчаную палітычную памылку.

3. Раённая газэта «Камунар», не перабудаваўшы сваёй апэрацыйна-масавай работы, ня была арганізатарам мас і ня здолела мабілізаваць іх на выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

ЦК адзначае недапушчальнасьць становішча ў сэнсе ігнараваньня з боку раённага РК рад аглядаў друку ў газэтах «Зьвязда» і «Рабселькор», якія сыгналізавалі аб яўна нездавальняючай рабоце раённай газэты «Камунар» у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

Сакратарыят ЦК пастанаўляе:

а) Райкому КП(б)Б неадкладна разгарнуць шырокую работу сярод партыйнай і камсамольскай арганізацыі, а таксама сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнага сэктару —па растлумачэньні вялізарных задач нізавога друку і рабселькораўскага руху, рашуча падкрэсьліваючы ролю і значэньне бальшавіцкай самакрытыкі, як зброі партыі супроць усякіх скажэньняў і апартунізму розных колераў.

б) Ажыцьцявіць канкрэтныя захады па кіраўніцтве раённай газэтай, выканаўшы пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыі пры райкомах КП(б)Б сталых раённых камісій па кіраўніцтве рабселькораўскім рухам.

в). Нізавы друк і рабселькораўскі рух перабудаваць у адпаведнасьці з пастановаю ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і рашэньнямі другога Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

г). Райкому КП(б)Б праверыць жывое кіраўніцтва з боку партыйных ячэек нізавым друкам і рабселькораўскім рухам у раёне, пад кутом выкананьня пастановы ЦК аб тым, што «кожная ячэйка, кожны член партыі нясе непасрэдную адказнасьць за становішча нізавога друку і рабселькораўскага руху». Райкому КП(б)Б выканаць дырэктывы партыі аб арганізацыі ў кожным калгасе, МТС, саўгасе і прадпрыемстве шматтыражнай, або насьценнай газэты, пры абавязковай умове забесьпячэньня іх партыйным кіраўніцтвам, дабіўшыся ажыцьцяўленьня лёзунгу: «кожны рабселькор—ударнік, кожны ударнік—рабселькор».

д) Культпрому ЦК забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб стварэньні старонкі на яўрэйскай мове ў Сеньненскай газэце (даць працаўніка і шрыфты на яўрэйскай мове).

е) Райкому КП(б)Б даўкамплектаваць раённую газэту бальшавіцкі вытрыманымі работнікамі, з тым, каб забясьпечыць жывую сувязь і кіраўніцтва рабселькорамі. Стварыць неабходныя абставіны для работы рэдакцыі раённай газэты.

ж) Пастанову апублікаваць у друку.

Узьнімаюць зябь.

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН

УБРАЦЬ З ПОЛЯ КОЖНЫ СНОП ІЛЬНУ,

пераапрацаваць і здаць у тэрмін дзяржаве валакно

У калгасах „Камунар" і „Камінтэрн" зацягваецца апрацоўка ільну

КОЙДАНАВА. У калгасе «Камунар» толькі цяпер скончылі церабленьне ільну. Марудлівасьць тлумачыцца выключна тым, што адсутнічае зьдзельшчына. Брыгада з 20 жанчын за дзень не магла выцерабіць аднаго гэктара ільну. У гэты самы час брыгада калгасу «Камунар» з 9 чалавек, якая езьдзіла на дапамогу калгасам Сіроцінскага раёну, выцярэблівала больш, чым адзін гэкт. у дзень. Увесь выцераблены лён (24 гэктары) яшчэ ляжыць на полі і мокне пад дажджом. Такое становішча і ў буйным калгасе «Камінтэрн». Неабходна тэрмінова зьвезьці лён. Поўнасьцю скарыстаць атрыманую ільнамалатарню для хутчэйшага абмалоту і потым расьцілу ўсяго ільну. Прарыў па ўборцы, абмалоце і расьцілу ільну калгасы «Камунар» і «Камінтэрн» павінны ліквідаваць у бліжэйшы час на аснове ўвядзеньня зьдзельшчыны, выходзячы з норм выпрацоўкі ўдарніка.

В.

На 20 дзён раней тэрміну

Тэмпы ўдарніц-калгасьніц Шклоўшчыны—ва ўсе калгасы

ШКЛОЎ. 20 верасьня ў Шклове адбыўся зьлёт калгасьніц-ударніц. Прысутнічала больш 100 дэлегатак. Калгасьніцы-ўдарніцы пастанавілі: «Улічваючы неабходнасьць сваячасовага забесьпячэньня сацыялістычнай прамысловасьці сырцом, правесьці пераапрацоўку ільну па-ўдарнаму і здаць лён дзяржаве на 20 дзён раней тэрміну, г. зн. да 10 сьнежня».

Калгасьніцы зьвяртаюцца з заклікам да ўсіх калгасьніц і калгасьнікаў Шклоўшчыны, каб яны далучыліся да гэтай пастановы.

Заклік ударніц-калгасьніц Шклоўшчыны павінны падхапіць усе калгасы Беларусі.

Ян. Н.

У Чашніках—самацёк

ЧАШНІКІ. Падрыхтоўка да ільназагатовак у Чашніцкім раёне ідзе самацёкам. Пляны ільназагатовак у раёне не абгавораны і не даведзены да сельсаветаў. Ільназавод да прыёмкі ільну не падрыхтаваны. Няма нават вагі. Растлумачальная праца вакол пытаньня ільназагатовак сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў не праведзена.

Райвыканком праяўляе яўна апартуністычную бязьдзейнасьць, што ставіць пад пагрозу пасьпяховае выкананьне пляну ільназагатовак па раёне.

Мікола Агністы, Чырвоназорскі.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў ільнаўборкі ў саўгасе Бігосава

ДРЫСА. У саўгасе Бігосава на 15 верасьня выцераблена толькі 300 гэктараў ільну, а па пляне трэба выцерабіць 670 гэктараў.

Выцераблены лён не апрацоўваецца і стаіць на полі ў снапох. Ураджай са 120 гэктараў зьвезен і на гумнах складзен у сьцірты, але і тут лён пад пагрозай псаваньня, бо салома не прасохла.

Гэтыя прарывы тлумачацца тым, што ня было праведзена ніякай падрыхтоўчай работы, ня ўмела скарыстоўвацца рабочая сіла.

З 2 да 5 верасьня ў саўгас было завербавана 200 чалавек, у большасьці партыйцаў і камсамольцаў.

У выніку злачыннай няўмелай арганізацыі працы 120 чалавек у адзін дзень выцярэблівалі 4 гэктары ільну.

Дырэкцыя і парт'ячэйка саўгасу ня здолелі выкарыстаць дапамогу мясцовага калгаснага і аднаасобнага сялянства. Машыны да ўборкі ільну ня былі падрыхтаваны. Рамонт ідзе марудна. Перавозачныя сродкі таксама не падрыхтаваны ў патрэбнай колькасьці.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны ўжыць неадкладныя меры для таго, каб ліквідаваць гэтыя прарывы. Патрэбна прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве ільнаўборкі.

Алесь Грачкін.

Калгасы ўступаюць у сацспаборніцтва

ТАЛАЧЫН. Калгас «Ударнік», Азарыцкага сельсавету, 20-га верасьня здаў на загатоўчы пункт 320 клг. ільна-загатовак і абавязаўся датэрмінова выканаць плян ільнаапрацоўкі і ільназагатовак. Калгас «Беларусь», Кохадаўскага сельсавету, першым у раёне 18-га верасьня здаў 256 кілёграм валакна.

Гэтыя калгасы выклікалі на сацспаборніцтва астатнія калгасы Азарыцкага сельсавету.

У. В.

Траста з 40 гэктараў ільну паднята

УВАРАВІЧЫ. Пасьляхова закончыўшы ўборку 100 гэктараў ільну, калгас імя Будзённага, на аснове зьдзельшчыны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгарнуў яго пераапрацоўку. Ураджай 40 гэктараў ільну падняты са сьцелішчаў, зьвезен і распачата мяцьцё. Ужо намята 320 клг. валакна. На мяцьці працуюць спэцыяльныя брыгады.

Калгас абавязваецца здаць лён датэрмінова.

Ураджай з астатніх 60 гэктараў ільну ў хуткім часе будзе здан на ільназавод.

А. Казіміраў.

На паперы лён убраны, а ў сапраўднасьці стаіць на полі

СМАЛЯВІЧЫ. У «Зьвяздзе» за 15 верасьня ў зводцы на 10 верасьня аб уборцы ільну паказана, што ў Смалявіцкім раёне лён выцераблены на 100 проц. Гэта не адпавядае сапраўднасьці. На 15 верасьня ёсьць такія калгасы, у якіх значная частка ільну ня выцераблена. Напрыклад, у калгасе «Чырвоны пуцілавец» ня выцераблена два гэктары, у калгасе «Культура» — 1,5 гэкт., «Перамога» — 6 гэкт. і г. д.

Вербін.

Ударыць па „очковтирателях" з Сураскага райза

СУРАЖ. Становішча пасеваў азімых, расьцілу ільну і сіласаваньня на Сураскім раёне сьведчыць аб цэлым радзе буйнейшых прарываў. Аднак, апартуністы і «очковтиратели» з райза лічаць непатрэбным правільна арыентаваць і мабілізаваць партыйна-камсамольскую арганізацыю, сельсаветы і ўсю грамадзкасьць на барацьбу з прарывамі, займаючыся замест гэтага «очковтирательством» — складаньнем зводак са столі.

Так, па зводцы, данай у НКЗ паказана, што на 15 верасьня плян пасеву азімых выканан на 91 проц., а паводле копіі зводкі райза лічыцца — 73,7 проц. на 20 верасьня. Прычым і гэты процант у сапраўднасьці меншы. Для пацьвярджэньня досыць падаць прыклад Краўцоўскага сельсавету. У зводцы райза паказана, што ў гэтым с-с. на 20 верасьня разаслана — 96 проц. ільну, а фактычна — 50 проц., засіласавана па зводцы райза — 41 проц., а фактычна — 0,03 проц. Такія-ж разыходжаньні паміж процантамі райза і фактычным становішчам ёсьць і па радзе іншых сельсаветаў. У райза адсутнічаюць зводкі ад значнай колькасьці сельскіх саветаў. Сельсаветы да складаньня зводак адносяцца недбайна. Курынскі сельсавет у зводцы ўстаўляе графу аб ... 50 гэкт... хлапка.

Такія безадказныя адносіны да апэрацыйных зводак павінны быць рашуча зьнішчаны. Ударыць па «очковтирателях» з Сураскага райза і Курынскага сельсавету.

Ф. Гольдман.

Пераапрацоўваць лён

ДУБРОЎНА. Па 7 калгасах Верацейскага сельсавету скончан абмалот і расьціл ільну 5-га верасьня. Посьпех дасягнут дзякуючы правільна наладжанаму ўліку працы, зьдзельшчыне і рацыянальнаму скарыстаньню сіл.

Баўтуноў.

Асеньняя сяўба.

ПРАВЕРЫМ ВЫКАНАНЬНЕ ЎКАЗАНЬНЯЎ тав. СТАЛІНА

УРАЎНІЛАЎКА

На „Камунары" яшчэ не ліквідавана

Чорнарабочы зарабляе больш фармоўшчыка

У падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў пануюць надзеі на самацёк

Макееўскі мэталюргічны гігант.

У часе прапрацоўкі прамовы правадыра партыі тав Сталіна, 600 рабочых заводу «Камунар» далі абяцаньне — не пакінуць свайго прадпрыемства да канца пяцігодкі. Аднычасова рабочыя патрабавалі ад заводзкіх арганізацый палепшэньня грамадзкага харчаваньня, забесьпячэньня рабочых кватэрамі. Раней аб кватэрным будаўніцтве шмат гаварылася на розных пасяджэньнях, але фактычна ў гэтай справе нічога не рабілася.

Пасьля прамовы тав. Сталіна заводзкія арганізацыі былі прымушаны паляпшаць аб забесьпячэньні рабочых кватэрамі. Пакуль што, набудаваны інтэрнат, у якім знаходзіцца 45 адзіночак. Мэталааб'яднаньне адпусьціла 365 тыс. руб. выключна на кватэрнае будаўніцтва. На гэтыя грошы заводакіраўніцтва мяркуе закупіць стандартныя дамы і гэтым самым жыльлёвы крызіс сярод рабочых заводу будзе ліквідаваны.

Палепшылася забесьпячэньне рабочых «Камунара». Амаль ўгодзена рабочыя атрымліваюць мясныя абеды. Катэгорыі рабочыя якія выконваюць цяжкую фізычную працу — кавалі і іншыя, атрымліваюць падвойную порцыю абеду.

Камунараўцы дабіліся абслугоўваньня ўсіх зьмен заводзкай сталоўкай. У кавальскім цэху для абслугоўваньня кавалёў адкрыты буфэт, які забясьпечваецца лепшымі відамі прадуктаў кавалёў.

На заводзе ў асноўным скончана пашпартызацыя варштатаў, ліквідавана безьлічка. Да кожнага варштату прымацавана 4 рабочых. Да кожнай зьмены прымацаваны майстар.

Дасягнуты посьпехі і ў справе заводзкага плянаваньня. Рабочыя кожнай зьмены маюць свой плян. Інструменты выдаюцца пэрсанальна кожнаму рабочаму.

Аднак на «Камунары» ня ўсе яшчэ зроблена. Пашпартызацыя варштатаў закончана, але яна праводзілася бяз удзелу высокакваліфікаваных рабочых. Пашпарты варштатаў складаюцца ў габінэце, як быццам яны патрэбны толькі для тэхнічнага нармаваньня і ня больш. Разумела, такая думка няправільная. Пашпарт варштату павінен ведаць кожны рабочы, які працуе на гэтым варштаце.

Работнікі ТНБ ня могуць яшчэ пахваліцца сваёй работай у справе ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі ў зарплаце. Пытаньню ліквідацыі ўраўнілаўкі надаецца вельмі мала ўвагі з боку заводзкага трыкутніка.

Чым можна апраўдаць такое становішча, калі рабочы вядучай прафэсіі зарабляе менш, чым рабочы таго-ж разраду лёгкай і навядучай прафэсіі. Напрыклад, сярэдняя заработная плата фармаўшчыка ліцейнага цэху складала ў жніўні 6 руб. 44 кап у дзень, у той час, калі зарплата рабочага бляшанага цэху была 7 руб. 21 кап.

Зарплата возчыка Каждана абагнала ў тым-жа жніўні ўсе вядучыя прафэсіі, склаўшы 7 руб. 92 кап.

Кавалі 4-га разраду ў жніўні зараблялі па 6 руб. у дзень, а чорнарабочы Мініч у жніўні меў па 6 руб. 59 кап.

Не ліквідавана ўраўнілаўка ў зарплаце і паміж начальнікамі цэхаў, хаця ёсьць розныя цэхі і.. розныя начальнікі.

Прагрэсыўна-прэміяльная сыстэма аплаты працы яшчэ не знайшла належнага адбітку ў цэхах. Унутры - брыгадны ўлік работы адсутнічае.

Надзвычайна слаба прасоўваюцца рабочыя з ніжэйшых кваліфікацый у вышэйшыя. Есьць такія выпадкі, калі рабочы другога разраду выконвае работу 4-га разраду на працягу 6-7 месяцаў і не пераводзіцца ў вышэйшы разрад. Напрыклад; дэмабілізаваны чырвонаармеец тав Крук на працягу году працуе на нарэзцы шрубаў: гэта работа чацьвертага разраду, але тав. Крук да гэтага часу яшчэ не пераведзен з другога разраду.

На расточцы падшыпнікаў рабочыя павінны атрымаць зарплату па 4-таму разраду, а атрымліваюць па другому разраду.

Такое становішча стварае стымул для лятунства. Са слоў самога дырэктара вдаць што моманты лятунства на «Камунары» ёсьць і на сёньняшні дзень.

Урэшце наконт забесьпячэньня заводу кадрамі рабочых. Па гэтай справе ў некаторых работнікаў заводу існуе заспакоенасьць.

— Пакуль што рабочых нам ня трэба. А калі патрэбны будуць — знойдзем...

Ці так павінны ставіць пытаньне кіраўнікі мэталаапрацоўчага заводу? А падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў? Праўда на заводзе арганізаваны тэхнікум для падрыхтоўкі кадраў, але ўкамплектаваньне тэхнікуму ідзе надзвычайна марудна. Гурткі па ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці працуюць таксама надзвычайна слаба.

Недахопы, якія ёсьць на заводзе, якія паслабляюць тэмпы выкананьня прамфінпляну, могуць быць ліквідаваны пры ўмове поўнай рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна.

Анд. Манькоў.

Пад знакам самацёку

Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» (Чашнікі) сыстэматычна ня выконвае сваёй праграмы. За жнівень фабрыка выканала праграму на 76%. Замест зьніжэньня сабекошту на 11,1% ёсьць павялічэньне на 1,3%. Прастоі папяровых машын дасягаюць 23%.

Лічбы сьведчаць аб тым, што партыйная і іншыя арганізацыі фабрыкі ня сумелі мабілізаваць рабочую масу і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал на ліквідацыю прарыву. Есьць усе ўмовы, каб выканаць праграмнае заданьне, аднак гэтыя магчымасьці не скарыстоўваюцца.

Праца па рацыяналізацыі пастаўлена дрэнна. Рабочыя прапановы ня выконваюцца. Тэхнічнае кіраўніцтва і праца бюро ІТР не прыстасавана да новых умоў, асабліва да абслугоўваньня начных зьмен.

Зусім невыстарчальна вядзецца праца па барацьбе за торф — апал, які знаходзіцца за 9 кілёмэтраў. Пракладка вузкакалейкі для падвозкі торфу спынілася таму, што фабрыка спадзяецца на торфазавод, а апошні на фабрыку.

Гаспадарчы разрахунак за паўтара месяца не дасягнуў сваёй мэты. Гэта тлумачыцца тым, што трыкутнік цэхаў недаацаніў гэтага пытаньня.

Ня лепш стаіць справа ў галіне рабочага забесьпячэньня. ЗРК і фабрычная сталоўка працуюць па старынцы.

Трэба вырваць з карэньнем апартуністычныя рэгаткі, якія перашкаджаюць пасьпяховаму выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну, трэба нарэшце поўнасьцю ажыцьцявіць ўказаньні тав. Сталіна.

Прадпрыемствы Мазыру не прапрацавалі прамовы т. Сталіна

Буйнейшыя прадпрыемствы г. Мазыру дагэтуль не прапрацавалі гістарычнай прамовы тав. СТАЛІНА.

Так, на ф-цы «Чырвоны Кастрычнік» толькі 12-га верасьня на тэхнічнай нарадзе прынялі пастанову аб пераводзе з кастрычніка цэхаў і брыгад на гаспадарчы разрахунак. ДАГЭТУЛЬ 25 ПРОЦ. РАБОЧЫХ ПРАЦУЮЦЬ ПАДЗЁННА. Ня ўведзена прагрэсыўна-зьдзельная аплата працы.

Кіраўніцтва заводаў «ПРАЛЕТАРЫ» і «ПРАФІНТЭРН» палец аб палец ня ўдарыла, каб перайсьці на гаспадарчы разрахунак. Ураўнілаўка і самацёк ня зьнішчаны.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў Мазыру павінны перабудаваць сваю работу. Дырэктыва адпаведных органаў аб пераводзе прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак павінна быць выканана.

ЯРГОЛІН Л. М.

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ СУБРАТУ ПА ЗБРОІ

СЁНЬНЯ ВЫШАЎ 2-ТЫСЯЧНЫ НУМАР ГАЗЭТЫ „АКЦЯБР"

6-ЦІГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ПАРТЫЙНАЙ ГАЗЭТЫ НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ—БУЙНАЯ ПЕРАМОГА ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ

Уступаючы ў 7 мы год свайго існаваньня, ідучы насустрач новым баявым дням, газэта „Акцябр" з яшчэ большай упартасьцю будзе змагацца за генэральную лінію партыі, за сацыялізм

Макет першага нумару газэты «Актябр».

Упарта змагацца за бальшавізацыю яўрэйскіх рабочых мас

ЦК КП(б)Б ШЛЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ГАЗЭЦЕ «АКЦЯБР» У ДЗЕНЬ ВЫХАДУ ЯЕ ДВУХТЫСЯЧНАГА НУМАРУ. ЦК СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО ГАЗЭТА «АКЦЯБР» І НАДАЛЕЙ БУДЗЕ ЗМАГАЦЦА З ЯШЧЭ БОЛЬШАЙ УПАРТАСЬЦЮ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, ЗА ДАЛЕЙШУЮ БАЛЬШАВІЗАЦЫЮ ЯЎРЭЙСКІХ РАБОЧЫХ МАС, ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б УПЕРАД ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Яшчэ вышэй сьцяг барацьбы за ленінскую нацпалітыку

У дзень 6-цігадовага юбілею і выхаду 2.000 нумароў газэты «Акцябр», Менскі гарадзкі камітэт КП(б)Б шле шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

6 год работы газэты як аднэй з мацнейшых і вастрэйшых зброяў партыі— гэта 6 год барацьбы супроць адхіленьняў ад ленінскай лініі партыі, за ленінскае адзінства нашай партыі, супроць нацапартунізму, супроць рэшткаў бундызму — за ленінскую нацыянальную палітыку.

2.000 нумароў газэты—гэта 2.000 моцных удараў па клясавым ворагу і яго агентуры. Гэта памножаная ў многа тысяч раз агітацыя і прапаганда генэральнай лініі партыі, памножаная арганізацыя мас на яе правядзеньне.

Юбілей «Акцябра» адбываецца ў той час, калі рабочыя і калгасьнікі СССР і БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, шмат маюць нябачаных дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, вядуць разгорнутае наступленьне па ўсім фронце. Гэта ставіць перад друкам рад адказьнейшых задач. Газэта «Акцябр», як актыўны праваднік генэральнай лініі партыі, мае таксама рад дасягненьняў, паказальнікам якіх зьяўляецца значнае арабочаньне апарату, рост радоў рабселькораў, тыражу і г. д. Моцнасьць газэты, яе вострасьць будуць забясьпечаны толькі тым, што яна ня спыніцца на гэтых дасягненьнях, а на іх аснове будзе рушыцца далей наперад разам з масамі і на чале мас, пад няўхільным кіраўніцтвам партыі. Моцнасьць і вострасьць газэты будзе забясьпечана далейшым яе набліжэньнем да яўрэйскіх рабочых мас, далейшым іх уцягненьнем да ўдзелу ў газэце.

Вітаючы «Акцябр», Менскі гарком спадзяецца, што газэта, працягваючы далейшую перабудову сваёй работы, зробіцца яшчэ больш вострай і моцнай зброяй партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію — за сацыялізм.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ЦК!

Няхай жыве бальшавіцкі друк — калектыўны агітатар, прапагандыст і арганізатар!

Менскі гарком КП(б)Б.

„Зьвязда"—газэце „Акцябр"

Бальшавіцкі друк сёньня адзначае буйную перамогу. 2.000 нумароў газэты «Акцябр» — гэта 2.000 гарачых дзён бальшавіцкай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць апартуністаў справа і «зьлева», гэта — 2.000 дзён нястомнай упартай барацьбы за бальшавізацыю яўрэйскіх рабочых і працоўных мас, за зжыцьцё рэштаў і перажыткаў Бунду і іншых дробна-буржуазных яўрэйскіх нацыяналістычных партый, за ўцягваньне яўрэйскіх працоўных мас у рэчышча барацьбы за сацыялізм.

У жорсткіх баёх з шавінізмам і нацыялізмаў усякага роду працякалі гэтыя дні. «Акцябр» у гэты пэрыяд паказаў узоры ленінскай барацьбы за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі супроць нацыянал-апартуністычных яе скажэньняў.

Недарма аб «Акцябры» з пенай на вуснах так часта ўспамінае замежны яўрэйскі буржуазны і сацыял-фашысцкі друк. Недарма ўнутры нашай краіны клясава-варожыя элемэнты і іх памочнікі горача ненавідзяць гэты баявы орган партыі.

Уступаючы ў сёмы год свайго існаваньня, ідучы насустрач новым баявым дням, няхай новыя тысячы нумароў «Акцябра» зьявяцца ў далейшым такой-жа моцнай і вострай зброяй барацьбы за сацыялістычнае наступленьне.

2000 дзён бальшавіцкай барацьбы

Сёньня выходзіць у сьвет двухтысячны нумар яўрэйскай газэты «Акцябр».

Яўрэйскі камуністычны друк у ВССР зарадзіўся ў 1918 годзе —у першым пэрыядзе існаваньня савецкай улады і шырока разгорнутай масавай агітацыі і прапаганды кампартыі сярод шырокіх пластоў яўрэйскіх рабочых і працоўных. Орган кампартыі ў той пэрыяд — «Штэрн» («Звезда») —зьяўляўся зброяй укараненьня бальшавіцкіх ідэй у яўрэйскія рабочыя масы і канчатковага разлажэньня бундаўскай меншавіцкай арганізацыі, якая мела яшчэ ў той час пэўны ўплыў на яўрэйскія рабочыя і рамесьніцкія масы. У 1921 годзе «Бунд» канчаткова ліквідуецца, яго пралетарская частка пераходзіць у кампартыю і пад гэтай назвай выходзіць орган ЦК КП(б)Б на яўрэйскай мове.

Але назва «Вэкер» нагадвала аб мінулым шляху «Бунду» і яго былым уплыве на масы яўрэйскіх рабочых, гэта было некаторым рудымэнтам (рэшткай) бундысцкіх традыцый, што магло прабуджаць у адсталай часткі яўрэйскіх рабочых ілюзіі аб рэвалюцыйнасьці бундаўскага мінулага. У сувязі з гэтым нарада яўработнікаў пры ЦК КП(б)Б у 1925 годзе выносіць пастанову аб перайменаваньні газэты «Вэкер» і наданьні ёй імя пралетарскай рэвалюцыі «Акцябр».

Такім чынам, перайменаваньне газэты «Вэкер» у «Акцябр» зьявілася крокам бальшавіцкага выхаваньня мас і адзнакай таго, што ў справе бальшавізацыі яўрэйскіх рабочых мас і ўкараненьня сярод іх ідэй Леніна дасягнуты вялікія посьпехі, што гэта работа ўзьнімаецца на больш высокую ступень. І сапраўды, шырокія яўрэйскія рабочыя масы і лепшая частка савецкай і пралетарскай інтэлігенцыі з вялікім задавальненьнем прынялі пастанову нарады яўрэйскіх работнікаў, ухваленую ЦК КП(б)Б. З гэтага часу газэта ЦК КП(б)Б на яўрэйскай мове канчаткова і рашуча пакончыла з рэшткамі забабонаў, якія маглі-б грунтавацца на тым, што назва «Вэкер» перайшла ў наш друк...

2.000 нумароў газэты «Акцябр» прадстаўляюць такую-ж колькасьць бальшавіцкіх працадзён упартай работы на працягу 6 год па бальшавізацыі яўрэйскіх рабочых мас і працоўных, па ўцягненьні гэтых мас у актыўную работу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, 2.000 нумароў газэты «Акцябр»— гэта 2.000 дзён упартай барацьбы за генэральную лінію партыі супроць контррэвалюцыйнага трацкізму, супроць правага ухілу—кулацкай агентуры ў нашай партыі—і яго саюзьніка «зьлева», супроць прымірэнцтва да гэтых ухілаў; гэта пэрыяд упартай барацьбы супроць усіх родаў нацыяналізму і шавінізму, у прыватнасьці супроць яўрэйскага шавінізму і супроць нацыянал-апартунізму ў рабоце сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных мас. 2.000 нумароў «Акцябра»— гэта ўцелясьненьне ўпартай барацьбы на працягу 6-ці год за ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі, за беларусізацыю, за шырока разгорнутую работу па будаўніцтве культуры нацменшасьцяй, барацьбы з яўрэйскім клерыкалізмам, барацьбы з рэшткамі ідэалізацыі «Бунду», з рэшткамі сіяністскіх і іншых нацыяналістычных настрояў, барацьбы за стварэньне пралетарскай літаратуры і мастацтва яўрэйскіх мас — нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

За гэты пэрыяд «Акцябр» перабудаваў сваю работу ў духу дырэктыў нашай партыі. Грунтоўна камунізаваны апарат рэдакцыі, высунута вялікая колькасьць рабочых на кіруючыя пасады. Павялічылася і вельмі вырасла армія рабсельсамкораў «Акцябр», якая дасягае на сёньняшні дзень 2.000 чалавек. Укараняецца апэрацыйнасьць у рабоце рэдакцыі, ажыцьцяўляецца курс на брыгадную работу, ажыцьцяўляюцца мэтады пасылкі выязных рэдакцый і буксіраў, арганізуюцца рэйды, налёты, пасты і г. д.

Асноўным і характэрным для работы «Акцябра» за апошні пэрыяд за гады ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну зьяўляецца — рашучы паварот газэты да пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва. На фоне гэтай барацьбы газэта выконвае задачы, ускладзеныя на яе партыяй, усё больш і больш навучаючыся змагацца за канкрэтныя вучасткі работы, адлюстроўваючы на канкрэтных задачах лёзунгі партыі і задачу барацьбы за яе генэральную лінію, супроць усялякіх ухілаў.

Трэба таксама адзначыць той вялікай палітычнай важнасьці факт, што «Акцябр», трапляючы ў замежныя краіны зьяўляецца неабходным памочнікам для нашых брацкіх кампартый, у прыватнасьці — для камуністычнага яўрэйскага друку капіталістычных краін Захаду, Усходу і Амэрыкі ў справе барацьбы супроць антысавецкай кампаніі. Гэта яшчэ больш абавязвае «Акцябр» да таго, каб ён і ў далейшым, змагаючыся за бальшавіцкія пляны сацбудаўніцтва, за ідэі Леніна, усямерна і найбольш поўна адлюстроўваў на сваіх старонках вялізарныя дасягненьні сацыялістычнай будоўлі ў нашай краіне, асабліва па лініі ўцягненьня ў сацбудаўніцтва шырокіх мас яўрэйскіх рабочых, працоўных і местачковай беднаты.

«Акцябр» адзначае свой шлях на працягу апошніх 6-ці год у момант, калі партыя і савецкая ўлада ажыцьцяўляюць пляны трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Гэты год рашучага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, год рашаючых перамог на фронце калектывізацыі вёскі і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, год «518» і «1040», год суцэльнай ліквідацыі няпісьменнасьці, год вялікіх перамог на фронце паляпшэньня матэр'яльных і бытавых умоў рабочай клясы і працоўных, —гэты год разам з гэтым зьяўляецца самым выдатным пэрыядам ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі па ўсім фронце, у прыватнасьці па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных.

Мы перажываем пэрыяд фарсаванай работы па ліквідацыі рэштак эканамічнай няроўнасьці былых прыгнечаных нацыянальнасьцяй, і гэта асабліва дае сябе адчуваць сярод мас яўрэйскіх працоўных і дэклясаванай беднаты. Недарма буржуазія, кулацтва, нэпманскія і шкодніцкія элемэнты прыкладаюць апошнія намаганьні ў барацьбе з ленінскай нацпалітыкай партыі. Мы гэту барацьбу бачым на радзе прыкладаў у рабоце сярод яўрэйскіх працоўных мас БССР, калі кулацкія і нэпманскія элемэнты імкнуліся і спрабуюць зараз сарваць калектывізацыю і саматужную кааперацыю сярод яўрэйскіх працоўных, у чым ім аказвалі дапамогу яўрэйскія нацыянал-апартуністы. Пад націскам клясава-варожых элемэнтаў мы мелі рад спроб праваапартуністычнага і нацапартуністычнага парадку, накіраваных да таго, каб сказіць ленінскую нацпалітыку і павесьці работу на шкодным рэчышчы. Партыя с посьпехам адбіла гэтыя спробы. У гэтай рабоце «Акцябр», як зброя КП(б)Б, адыграў ролю бальшавіцкага сыгналізатара і змагара.

Посьпехі партыі па лініі ленінскай нацпалітыкі сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных настолькі вялікія, што замежная буржуазія і сацыял-фашысцкі яўрэйскі друк за апошні пэрыяд лічыць неабходным амаль зусім маўчаць аб становішчы яўрэйскіх мас у СССР, лічачы нязручным гаварыць аб дасягненьнях і немагчымым крычаць аб гібелі яўрэйскага народу, наколькі яму ніхто ня можа паверыць.

Зброяй барацьбы супроць хлусьні і паклёпаў замежнага яўрэйскага буржуазнага і бундаўскага друку зьяўляецца «Акцябр». І недарма фашысты і сацыял-фашысцкі замежны друк, асабліва Польшчы, ад часу да часу лічаць сваім абавязкам абліваць памыямі «Акцябр», адчуваючы ў ім свайго заўзятага ворага.

Побач з буйнымі посьпехамі «Акцябр» мае ў сваёй рабоце і асобныя прарывы, ён ня ўнікнуў і асобных памылак. Мы лічым сваім абавязкам спэцыяльна гэта падкрэсьліць. Асабліва невыстарчальная і незадавальняючая работа па ўкараненьні газэты сярод шырокіх мас рабочых, у прыватнасьці сярод новаўступаючых, ня выхаваных у пралетарскім, калектывістычным духу пластоў яўрэйскіх рабочых, на нашы фабрыкі і заводы. У гэтым сэнсе бязумоўна ў частцы партыйных арганізацый недаацэньваецца роля камдруку на яўрэйскай мове. І ў гэтым сэнсе мы павінны ў бліжэйшы час зрабіць рэзкі пералом. Невыстарчальная таксама работа па кантролі выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб уцягненьні ў сацбудаўніцтва яўрэйскіх працоўных і беднаты, аб разгортваньні культурнага будаўніцтва на роднай мове і г. д. За гэту зіму мы мелі пэўны прарыў у рабоце па выкананьні перасяленчых нарадаў, і «Акцябр», ажыцьцяўляючы правільную лінію ЦК-КП(б)Б, што і было адзначана ЦО партыі «Праўдой», ня зусім своечасова і шырока разгарнуў гэту работу. «Акцябр» выпраўляе гэтыя недахопы ў працэсе работы. Але разам з тым «Акцябру» неабходна яшчэ больш узьняць тэмпы, асабліва па разгортваньні масавай работы сярод яўрэйскіх рабочых і працоўных, бо гэты вучастак барацьбы за сацыялізм зьяўляецца асабліва важным у сучасны момант.

Перад «Акцябром» стаіць задача барацьбы за выкананьне пляну апошняга году пяцігодкі, за высокія тэмпы ў галіне ленінскай нацпалітыкі, за разгорнутае культурнае будаўніцтва, за далейшую бальшавізацыю яўрэйскіх рабочых мас, за ўкараненьне ленінскіх ідэй у шырокія пласты яўрэйскіх працоўных. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)В «Акцябр», ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, з пастаўленымі задачамі справіцца.

Х. ДУНЕЦ.

ЗА ДОБРАЯКАСНЫ ХЛЕБ

РАЎНЕНЬНЕ НА ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНУЮ БРЫГАДУ тав. МАРОЗА!

20-га верасьня ў клюбе менскага хлебазаводу адбылася агульна-заводзкая вытворчая канфэрэнцыя па якасьці хлеба.

У сваім дакладзе аб выкананьні прамфінпляну — дырэктар хлебазаводу тав. Масюкевіч, адзначыў, што хлебазавод дагэтуль не перабудаваў сваёй работы так, каб ліквідаваць значныя недахопы па вытворчасьці, асабліва па якасных паказальніках.

Экспэдыцыя заводу знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Склады не адпавядаюць свайму прызначэньню. Адсутнічае маркіроўка мукі. Дагэтуль не прымацаваны да заводу млыны, ня гледзячы на тое, што ёсьць адпаведныя дырэктывы.

Лесбел ня выконвае сваіх абавязацельстваў па забесьпячэньні апалам, што выклікае перабоі ў рабоце хлебазаводу. Дровы бываюць дрэннай якасьці.

Спрэчкі, якія разгарнуліся пасьля дакладу выявілі факты недапушчальных адносін да якасьці хлеба з боку некаторых майстраў, хлебнай інспэкцыі, а таксама працаўнікоў прылаўка.

Хлебінспэкцыя працуе дрэнна. Яна дае блытаныя ўказаньні. Няма належнага кантролю за выпускаемай прадукцыяй. Прапановы рабочых не ажыцьцяўляюцца.

Лябараторыя не разгарнула сваёй працы. Яна толькі фіксуе факт кепскай выпячкі хлеба і не дае патрэбных аналізаў. Ураўнілаўка ў аплаце ня зьнішчана. Чатыры зьмены працуюць калектыўна, атрымоўваюць агульны прыработак і дзеляць яго пароўні па брыгадах.

Прадстаўнік ЦП саюзу кааперацыі і дзяржгандлю тав. Ахрамовіч прывёў абураючы факт злачынных адносін некаторых працаўнікоў прылаўка да хлеба. Так, у аднэй хлебнай краме Ляхаўскага раёну працаўнік наклаў на табурэтку булку хлеба, каб лепш было сядзець.

Рабочы хлебазаводу тав. Шарай гаворыць, што ёсьць усе магчымасьці для паляпшэньня якасьці прадукцыі. Чырвонасьцяжная брыгада тав. Мароза, на працягу месяца дала 100 проц. стандартнага хлеба. Экспэдыцыя павінна сачыць за працай возчыкаў і змагацца з няўважлівымі адносінамі да перавозак хлеба.

Трэба адзначыць, што на вытворчую канфэрэнцыю па якасьці хлеба, не зьявіўся прадстаўнік хлебінспэкцыі. Гэта сьведчыць аб тым, што Хлебінспэкцыя недаацэньвае значэньня гэтай канфэрэнцыі і барацьбы за якасьць хлеба.

Вытворчая канфэрэнцыя вынесла рад канкрэтных прапаноў, накіраваных на паляпшэньне якасьці хлеба. Канфэрэнцыя абавязала старшых майстраў маркіраваць увесь выпускаемы хлеб. Павінен быць створаны запас мукі і апалу для хлебазаводу ня менш, як на 7 дзён. Ставіцца пытаньне перад Саюзхлебам аб прымацаваньні адпаведных млыноў да хлебазаводу. Павінна быць уведзена прэміяльна-прагрэсыўная зьдзельшчына па якасьці прадукцыі.

З мэтай зьнішчэньня перабояў у забесьпячэньні хлебных крам хлебам удзельнікі канфэрэнцыі выказаліся за перанясеньне вопыту Масквы — развозку хлеба па крамах ў начны час. Транспарт хлебазаводу павінен быць павялічан на 10 адзінак.

М.

Вытворчыя нарады праводзіліся ў... лютым

У пачатку верасьня брыгады газэты «Зьвязда» правялі рэйд па праверцы якасьці хлеба менскага хлебазавода і яго аддзяленьня.

Брыгады высьветлілі рад фактаў, якія перашкаджаюць выпуску добраякаснага хлеба. Так, на хлебазаводзе адчуваецца недахват чанаў для кваскі. Няма патрэбнай колькасьці камплектаў форм. Існуе ўраўнілаўка аплаты. Дырэкцыя заводу ня ўжывае належных мер да зьнішчэньня недахопаў у рабоце.

Крыху лепшыя паказальнікі выкананьня прамфінпляну мае аддзяленьне хлебазаводу. Але ёсьць перабоі ў рабоце з-за адсутнасьці апалу. Культмасавая праца сярод рабочых не праводзіцца. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ніхто ня кіруе. Заўком мала наведвае аддзяленьне. Вытворчыя нарады з лютага месяца не праводзілася.

Збожжа на млын імя Дзяржынскага паступае сухое. Жыта захоўваецца добра. Якасьць мукі здавальняючая. Ёсьць ударныя брыгады, сярод якіх вядзецца належная работа. Але дрэнна наладжана грамадзкае харчаваньне рабочых, што мае ўплыў на работу.

Брыгада «Зьвязды»:
ДЗІВАШОВА, ЖУК, КАЛУГІН, ТРЭБНІК, ШАПІРА, ПАЛЬТЭР, ГОЛЬДЗІН, ЛЕДВІЧ і ЯНКОЎСКІ.

За моцную сувязь фабрык і калгасаў, за ўзаемную дапамогу!

У адказ на прамову тав. Сталіна, паміж фабрыкай «Дзьвіна» і Лёзьнянскім раёнам быў заключан сацдагавор, які мяркоўваўся на шырокіх рабочых сходах фабрыкі і ў калгасах.

Для рэалізацыі сацдагавору на фабрыцы «Дзьвіна» быў выбран штаб, але ён з даручанай работай ня справіўся. Таму бюро парткалектыву фабрыкі выбрала новы, больш працаздольны штаб, які зараз-жа распачаў сваю дзейнасьць па рэалізацыі сацдагавору паміж рабочымі фабрыкі і калгасьнікамі Лёзьняншчыны.

Камандыравала рабочая брыгада камсамольцаў з пяці асоб для дапамогі калгасам і аднаасобнікам па ўборцы, працоўцы і здачы дзяржаве ільну. Брыгада ахапіла 8 сельсаветаў, адначасова правяла рад іншых кампаній.

Акрамя таго, у найбольш адсталыя калгасы выяжджала брыгада рэдкалегіі насьценгазэты «Чырвоная Дзьвіна», якая ў калгасе «Новае жыцьцё» правяла сход, выпусьціла насьценгазэту, правяла працу па наладжваньні мясцовай газэты, а таксама ўзмацніла сувязь паміж фабрыкай і калгасьнікамі Лёзьняншчыны.

На дапамогу калгасьнікам Лёзьнянскага раёну па церабленьні ільну 44 рабочыя ў свой выходны дзень выехалі ў калгас «Новае жыцьцё» і выцерабілі звыш 4 гэктараў. Брыгада цесьляроў з 3-х асоб працавала ў калгасах «Сац. бацькаўшчына» і «Страх ворагам» на працягу двух дзён па пабудове сьвінарніка і мачыльных ям. Разам з гэтым была камандыравана кіно-перасоўка, якая ў калгасах «Сац. бацькаўшчына» і «Страх ворагам» арганізавала два кіносэансы.

У калгасы «Трудавік» і «Бязбожнік» пасланы два рахункаводы і адзін брыгадзір па наладжваньні правядзеньня зьдзельшчыны і асабліва па нормах выпрацоўкі і расцэнкі ільну.

Рабочыя фабрыкі «Дзьвіна» свае абавязкі выконваюць і ўпэўнены ў тым, што калгасьнікі Лёзьняншчыны таксама не застануцца ў даўгу. Яны прымуць усе захады для таго, каб своечасова забясьпечыць сацыялістычную прамысловасьць патрэбным сырцом.

Будзем трымаць моцную сувязь паміж вытворнікамі і апрацоўшчыкамі ільну і аказваць узаемную дапамогу.

Баравік, Афанасьеў.

Набліжаецца чорная зіма капіталізму

(Аб хваляваньнях у ангельскім ваенным флёце)

Хваляваньні ў ангельскім ваенным флёце патрасьлі сусьветную буржуазную грамадзкую думку. Патрасьлі з тым большай сілай, што ўжо даўно пад уплывам страшэннага эканамічнага крызісу, ахапіўшага ўвесь капіталістычны сьвет — найглыбейшы непакой ахапіў кіруючыя рады буржуазіі.

«Адзнак выразна выяўленага пачуцьця няпоўнацэннасьці капіталістычнага сьвету, замяшальнасьці і гульлівасьці планава-гаспадарчымі сацыялістычнымі ідэямі памнажаюцца», — піша нямецкая «Франкфуртэр цэйтунг».

«Мы ня сумняваемся, што нашым чытачам надакучылі сусьветныя прадраканьні аб зімовым беспрацоўі. Мы сталі ад гэтых прадраканьняў таксама, як і яны. Але і галодным таксама надакучае галадаць. Калі на працягу бліжэйшых месяцаў краіне пагражае сапраўднае няшчасьце,—а мы думаем, што гэта так, — дык было-б шаленствам закрываць на гэта вочы»,—піша нью-ёркская «Нэйшен».

«Напомнім яшчэ раз, што ў Эўропе ля 10 мільёнаў поўных моцы людзей, збаўленых, аднак магчымасьці працаваць. Эўропа ня ведае як іх накарміць, як іх аплаціць ужо ў самай блізкай будучыне, як знайсьці для іх нармальны заработак, як разьмясьціць на рынку тавары, якія маглі-бы вырабіць гэтыя рабочыя рукі, ні, нарэшце, нават таго, як забясьпечыць ім магчымасьць выезду за межы Эўропы. Вось дзе сапраўдная і адзіная прычына нашых цяперашніх затрудненьняў. Усё іншае — ня больш, як сымптомы хваробы», — піша парыская «Пці Парызьен».

«Узімку 1932 г. эканамічны крызіс прымае катастрафічныя нябачаныя ў найнавейшай гісторыі разьмеры», — ускрыквае ангельскі эканаміст Джордж Пэш.

Гэта ўжо не адзінкавыя, разрозьненыя крыкі напалоханых усё больш рэальнай зданьню сацыяльнай рэвалюцыі буржуа,—не, гэта ўжо крыкі СОС, якія зьяўляюцца для капіталістычнага сьвету першым сыгналам блізкага канца.

І вось у абстаноўцы гэтага напружанага чаканьня ракавога часу, чырвоным полымем узрываецца тэлеграфнае паведамленьне: **значная частка ангельскага флёту, гэтага апплоту брытанскага імпэрыялізму, ахоплена хваляваньнямі.**

Есьць ад чаго прыйсьці ў паніку . . .

Не дарма, ангельскі ўрад пасьпяшыў пайсьці на ўступкі, а францускі афіцыёз сьпяшыць прызнаць патрабаваньні ангельскіх маракоў «справядлівымі», каб хаця гэтым двудушным прызнаньнем некальскі супакоіць буржуа, ахопленых панікай і нянавісьцю да тых, хто асьмеліўся «пахістаць усе асновы».

«Той факт, што ўрад павінен быў уступіць хаця і справядлівым патрабаваньням маракоў, пад пагрозай бунта, у краіне, якая вядома вялізнай павагай да традыцый і цьвёрдым патрыятызмам, перавышае ўсё, што можна было меркаваць».

Парыская правая «Ордр» піша: «Паўстаньні ў ангельскім флёце паказчык слабасьці ня толькі асноўнага элемэнту вайсковай абароны краіны, але і ўсяго нацыянальнага будынку».

Гэта паўтарае і нямецкая «Франкфуртэр Цэтунг»: «Тое што адбылося ў Англіі, даволі ганебна і прымушае задумацца. Праўда, сур'ёзных палітычных вынікаў, — асьцярожна супакойвае газэта, — здаецца, можна і не баяцца, хаця цяпер у рантоўным выбуху выявіліся надзвычай радыкальныя настроі ангельскага флёту. Ангельскаму ўраду ва ўсякім выпадку будзе ня лёгка вынішчыць школу, якая нанесена гэтым паўстаньнем як унутры краіны, так і па за яе межамі».

«У будоўлі ганаровай імпэрыі зьявіліся шчыліны», — так акрэсьлівае становішча парыская «Журналь».

Не зьявіліся, г. зн. не ўпяршыню зьявіліся, а выявілася ў такой форме, якая прымусіла «задумацца», як гаворыць «Франкфуртэр Цэйтунг», усю сусьветную буржуазію.

Хваляваньні ў ангельскім ваенным флёце з выключнай яркасьцю выкрылі той найглыбейшы эканамічны занепад, да якога дайшла капіталістычная гаспадарка Вялікабрытаніі. Каб выратаваць свае становішча сусьветнай дзяржавы, каб выратаваць пахістаны фунт стэрлінгаў, устойлівасьць якога — залог устойлівасьці Брытанскай імпэрыі, ангельскія буржуазныя партыі ў цесным саюзе з лейбарыстамі парашылі перайсьці ў наступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы і ўсіх працоўных Англіі. Ад прынясеньня «ахвяр» на алтар ангельскага капіталізму і імпэрыялізму ня былі вызвалены і маракі брытанскага флёту, якім пагражала зьніжэньне зарплаты на 25 проц. Адказам на гэту пагрозу і зьявіліся хваляваньні, якія хутка распаўсюдзіліся па судох флёту «яго вялікасьці ангельскага караля».

Неабходнасьць для ангельскай буржуазіі ўжываць такія крайнія меры надзвычай паказальна: яна сьведчыць аб тым, што Англія перастае быць краінай, у якой буржуазія, у выніку страшэннай эксплёатацыі працоўных мас у дамініёнах і калёніях была ў стане дзяліцца часткаю сваіх каляніяльных звышпрыбыткаў з верхавіннымі пластамі рабочае клясы, а сусьветны эканамічны крызіс, які асабліва моцна і ўпарта б'е па цьвярдыні ангельскага капіталізму, размыў той фундамант, на якім вырастаў увесь будынак ангельскага сусьветнага ўладарства, — **фінансавую і гандлёва-прамысловую магутнасьць злучанага каралеўства.** З цэнтру, які забясьпечваў увесь сьвет, і ў першую чаргу ангельскія даміліёны і калёніі капіталамі, Лёндан пад ударам эканамічнага крызісу ператвараецца на нашых вачох у банкірскі дом, які адчувае патрэбу ў замежных сродках і звяртаецца за зьнешняй дапамогай. З краіны, якая забясьпечвала сваімі прамысловымі вырабамі, вугалём і сталью ўвесь сьвет, і ў першую чаргу свае даніміёны і калёніі, Англія, ператвараецца ў краіну, якая страчвае зьнешнія рынкі і вымушана па-ранейшаму ўвозіць хлеб і сырэц, а па-новаму — нафту. Дзяржава, якая стаіць на першым месцы па разьмерах сваёй прамысловасьці, ахоплена прамысловым застоям, пад уплывам якога заводы і фабрыкі працуюць з мізэрнай нагрузкай, а рабочая кляса налічвае каля 2.800 тыс. беспрацоўных.

Усю глыбіню крызісу, які перажывае Англія, выразна характарызуе паніжэньне ўсіх асноўных паказальнікаў эканамічнай актыўнасьці краіны.

Ангельская буржуазія пачынае пражываць свой асноўны капітал.

«У будынку гордай імпэрыі зьявіліся шчыліны». Глыбокія шчыліны, для залюкі якіх у ангельскай буржуазіі не хапае золатога цэмэнту. Не хапае яго і ў большасьці другіх капіталістычных краін.

Гэта выявілі перад тварам усёй сусьветнай буржуазіі хваляваньні ў ангельскім ваенным флёце. Вось чаму яны глыбока сымптоматычны і вось чаму яны так глыбока патрасьлі буржуазію ўсяго сьвету.

За ўсхваляванымі і абуранымі тварамі брытанскіх маракоў сусьветная буржуазія ўжо бачыць здань развалу Брытанскай імпэрыі, здань сацыяльнай рэвалюцыі у Англіі, вялікай пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім капіталістычным сьвеце.

С. Л.

Камсамолія саўгасу імя тав. Сталіна апраўдвае званьне шэфаў сіласаваньня

Напярэдадні XVII МЮД'у ў саўгасе імя т. Сталіна быў абвешчан ударны трохдзённік па ліквідацыі прарыву на фронце сіласаваньня. Камсамольцы, арганізаваўшы вакол сябе беспартыйную моладзь на працягу трох вечароў заклалі ў траншэю 100 тон зялёнай масы.

Але плян сіласаваньня па саўгасе яшчэ ня выкананы; XVII МЮД прайшоў — барацьба за сілас працягваецца. Камсамольцы саўгасу імя т. Сталіна выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва камсамольцаў саўгасаў Вязынь-Фаніпаль і Негарэлае.

Адамовіч.

Калгас „Новая Аляксееўка" апрацаваў і здаў дзяржаве 1.643 кілёграмы ільнавалакна

БРАГІН. Калгас «Новая Аляксееўка», Крычанскага сельсавету, шырока разгарнуў пераапрацоўку ільну і 18-га верасьня здаў на загатоўчыя пункты 1643 кілёграмы валакна першага гатунку.

Калгас паказвае прыклад суседнім калгасам, як трэба змагацца за лён.

Кашлачоў.

Калгасныя масы ўключаюцца ў конкурс

МСЬЦІСЛАЎ. Па раёне разгарнулася праца па ўключэньні ў конкурс на лепшую і хутчэйшую пераапрацоўку ільну. Калгасы Ходасаўскага сельсавету першымі ўключыліся ў конкурс. Вызначаны адказныя таварышы за правядзеньне працы па пераапрацоўцы і здачы ільну дзяржаве. Калгасы абавязаліся лён здаць да 1-га сьнежня, а пяньку да 1-га студзеня.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШЫЯ КАЛГАСНЫЯ ФЭРМЫ

Кожны прапушчаны дзень—

удар па камплектаваньні стада

ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ—СЛУЦКУ, ЧЭРЫКАВА І ПЛЕШЧАНІЦ—ВА УСЕ РАЁНЫ БССР

На сьвінагадоўчай фэрме калгасу «Шлях сацыялізму».

У Барысаве за камплектаваньне ніхто не адказвае

Перадавыя калгасы і камуны Барысаўскага раёну сапраўды пабаявому ўзяліся за рэалізацыю адозвы ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі. Рад калгасаў перавыканалі ўжо пляны камплектаваньня. Так, калгас імя Леніна плян камплектаваньня сьвінагадоўчай фэрмы выканаў на 136 проц., калгас «Новае жыцьцё»—на 116 проц. і камуна «Інтэрнацыянал»—на 113 проц.

Гэта паказвае, што пляны камплектаваньня сьвіного стада зусім рэальны і могуць быць выкананы. Паводле пляну да 1-га кастрычніка ў сьвінагадоўчых фэрмах павінна быць сканцэнтравана 3.150 сьвінаматак. Гэты плян да калгасаў даведзен толькі на палову. Толькі па 31 калгасе райкалгассаюз намеціў паставіць 1.575 сьвінаматак. Але і гэты, на палову скарочаны плян, выканан толькі на 47 проц. Райкалгассаюз абмежаваўся толькі агульнай дырэктывай.

У большасьці сьвінагадоўчых фэрм зьдзельшчына ня ўведзена. Райкалгассаюз да гэтуль ня вылучыў члена праўленьня, які-б адказваў за ход камплектаваньня і работу фэрм.

Ня гледзячы на тое, што ў раёне ёсьць 2 вэтэрынарныя дактары, вэтэрынарны нагляд нікуды ня варты.

Райкалгассаюз павінен неадкладна перабудаваць сваю работу. Камплектаваньне стада—гэта адказьнейшая задача павінна быць выканана ў самы кароткі тэрмін.

Барысаўскі.

Дробная жывёлагадоўля ігнаруецца

БРАГІН. (Наш кар.). Наяўнасьць добрых глебавых умоў і сенажацяў у раёне спрыяе разгортваньню жывёлагадоўлі. І сапраўды, Брагіншчына вызначана, як раён разгортваньня дробнай жывёлагадоўлі. Да канца 1931 году тут павінна быць арганізавана 30 сьвінагадоўчых калгасных фэрм са стадам у 3.040 сьвінаматак і 2 птушніцкія фэрмы з пагалоўем у 2.000 штук. **3.506 адкормленых сьвіней павінен здаць раён дзяржаве.**

Але гэта баявая праграма выконваецца вельмі нездавальняюча. Плян камплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм выканан толькі на 35 проц. Яшчэ горш са здачай таварнай прадукцыі. З выканачаных 3.506 адкормленых сьвіней здана ўсяго толькі 245 — 7 проц. Да арганізацыі птушніцкіх гаспадарак яшчэ нават і ня прыступлена.

Важнейшая дырэктыва партыі аб разгортваньні дробнай жывёлагадоўлі, якая павінна ў найкарацейшы тэрмін вырашыць мясную праблему, у Брагінскім раёне такім чынам ігнаруецца. Адозва партыі і ўраду аб разгортваньні жывёлагадоўлі не даведзена яшчэ да калгасных мас.

Молат.

Дабіць абязьлічку

У калгасе **ІМЯ СЬВЯРДЛОВА**, Рагачоўскага раёну, сьвінагадоўля да апошняга часу была забытай галінай гаспадаркі. Лепш за ўсё аб гэтым гаворыць той факт, што за год 53 сьвінаматкі далі 50 штук парасят. Гэта значыць, што за год сьвінаматка дала менш аднаго парасяці. Гэта зьяўляецца вынікам таго, што ў сьвінарніках **увесь час панавала абязьлічка ніхто не адказваў за работу.** Сьвіньні стаялі па калені ў брудзе, у цесных і вільготных сьвінарніках. На прагулку іх ніколі не выпускаюць.

Усе гэтыя хібы выкрыты калгасьнікамі на агульным сходзе пры абгаварэньні адозвы партыі і ўраду. Калгасьнікі парашылі арганізаваць сьвінагадоўчую фэрму, вылучылі загадчыка і пастаянную брыгаду сьвінарак.

Сходам пастаноўлена да канца году павялічыць колькасьць сьвінаматак да 150

Я. Савіцкі.

Кандыдаты на прэмію

Ужо прайшоў значны тэрмін з часу апублікаваньня гістарычнай адозвы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Рад раёнаў ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ўзяліся за РЭАЛІЗАЦЫЮ гэтай адозвы змаглі мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў на ДАТЭРМІНОВАЕ укамплектаваньне СЬВІНАГАДОЎЧЫХ І МАЛОЧНЫХ ТАВАРНА - КАЛГАСНЫХ ФЭРМ.

СЛУЦКІ раён перавыканаў плян арганізацыі сьвінагадоўчых фэрм. Арганізавана 70 фэрм замест 38 паводле пляну. На фэрмах пастаўлена 3.097 дарослых сьвінаматак — 89,3 проц. гадавога заданьня. На адкорм пастаўлена 960 падсьвінкаў. У фэрмах закладзена 1.160 тон сіласу.

ПЛЕШЧАНІЦКІ раён мабілізаваў калгасныя масы і забясьпечыў перавыкананьне пляну камплектаваньня СТФК на 22,5 проц. (пастаўлена 1.470 дарослых сьвінаматак). Будаўніцтва сьвінарнікаў выканана на 60 проц.

ЧЭРЫКАЎСКІ раён плян арганізацыі СТКФ выканаў на 141,5 проц. і укамплектаваў іх на 90,1 проц. Засіласавана 1.020 тон.

Рад фэрм дасягнулі бліскучых посьпехаў у камплектаваньні свайго сьвіного стада і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

СТКФ калгасу «БАТРАК» (СЛУЦКІ раён) плян камплектаваньня фэрмы сьвінаматкамі ў 200 шт. перавыканала на 12 шт., ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ 47 СЬВІНЕЙ І ПАСТАЎЛЕНА НА АДКОРМ 36. Плян сіласаваньня перавыканан на 35 тон.

СТКФ «НОВЫ МІР» (ЧЭРВЕНЬСКІ раён) заданьне на 250 сьвінаматак выканала. Пабудаван сьвінарнік і заканчваецца будаўніцтва другога сьвінарніка.

СТКФ калгасу «СЛУЧ» (СЛУЦКІ раён) паставіла 180 сьвінаматак, пабудавала сіласную вежу і заклала 150 тон сіласу, пабудован новы сьвінарнік на 96 сьвінама[...] і 4 прыстасавана. ФЭРМАЙ ЗДАНА 38 СЬВІНЕЙ ДЗЯРЖАВЕ. Уведзена зьдзельна-прэміяльная аплата (па павялічэньні вагі і вывадку парасят) у працаднёх.

СТКФ калгасу «ЧЫРВОНЫ БАЕЦ» (ЖЛОБІНСКІ раён) паставіла 50 сьвінаматак сіламі саміх калгасьнікаў.

СТКФ калгасу «БАЛЬШАВІК» (СТАРА-ДАРОСКІ раён) паставіла 140 сьвінаматак (па пляне 150), з іх 80 старэй 8-ці месяцаў. ЗДАНЫ ДЗЯРЖАВЕ 32 ШТУКІ і пабудован сьвінарнік на 100 штук.

СТКФ калгасу «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» (ЧАВУСКІ раён) плян камплектаваньня ў 100 сьвінаматак перавыканала на 9 штук. Пабудован новы сьвінарнік, выканан плян сіласаваньня (100 тон).

СТКФ калгасу «СЕРП І МОЛАТ» (ЧАВУСКІ раён) укамплектавала фэрму на 173 проц. (пастаўлена 167 сьвінаматак замест 96). Пабудован новы сьвінарнік выканан плян сіласаваньня на 100 працантаў.

Перадавымі раёнамі па АРГАНІЗАЦЫІ І КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ МАЛОЧНЫХ ФЭРМ зьяўляюцца наступныя:

СЛУЦКІ раён выканаў плян камплектаваньня на 140 проц. (заданьне 1.400 кароў—пастаўлена 1.982). ЗАДАНЬНЕ ПА ЗДАЧЫ МАЛОЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ ВЫКАНАНА НА 110 ПРОЦ. (гадавы плян здачы 6.750 цэнтнэраў, а здана 7.378 цэнтнэраў). Разгорнута будаўніцтва 1.540 месц замест 500 паводле пляну.

БУДА-КАШАЛЕЎСКІ раён плян камплектаваньня МТКФ выканаў на 105 проц. і на 10 верасьня здана 93 проц. гадавога пляну малочнай прадукцыі.

РАГАЧОЎСКІ раён ударнымі тэмпамі перавыканаў плян камплектаваньня МТКФ. Пастаўлена 1.471 карова замест 800 паводле пляну — 183 проц. Будуецца 800 месц замест пляну 400.

ЗАСЛАЎСКІ раён таксама плян укамплектаваньня МТКФ выканаў на 105 проц. і здаў 101 проц. гадавога пляну малочнай прадукцыі. Будуецца 600 месц (замест плянавага заданьня ў 300).

Найбольш ПАКАЗАЛЬНАЙ птушніцкай таварнай фэрмай зьяўляецца фэрма калгасу «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» (ЗАСЛАЎСКІ раён). У фэрме скончана будаўніцтва птушніка на 1.000 штук, выведзена 400 штук куранят і датэрмінова скончана камплектаваньне маточным стадам. Адыход маладняка складае толькі 2 проц.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ (пад старшынствам тав. МІЦЬКОВА) па правядзеньні дэкадніка агляду жывёлагадоўчых таварна-калгасных фэрм, абмеркаваўшы гэта пытаньне на сваім пасядзэньні, ВЫЛУЧЫЛА ВЫШЭЙПАМЯНЁНЫЯ РАЁНЫ, СТКФ І ПТКФ ПЕРШЫМІ КАНДЫДАТАМІ на атрыманьне ПРЭМІІ.

10 кастрычніка на пасяджэньні камісіі прэміі будуць разьмеркаваны канчатнова.

У плянах і... у сапраўднасьці

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. Старадароскі раён —адзін з асноўных жывёлагадоўчых раёнаў БССР. Так адзначана ў пляне раёнаваньня сельскай гаспадаркі БССР. Фактычна-ж раённыя арганізацыі да апошняга часу справай жывёлагадоўлі не цікавіліся.

У раёне ёсьць усе магчымасьці для выкананьня пляну камплектаваньня стада. Да канца 1931 году ў сьвінагадоўчых фэрмах раёну павінна быць **2.500 сьвінаматак.** Зараз мы маем усяго **467.** Гэта значыць, што плян камплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм выканан на 19 процантаў. Большая частка жывёлагадоўчых калгасаў ня ўключылася ва ўсебеларускі конкурс на лепшыя фэрмы. Конкурснае раённае бюро пакуль што— пустое месца.

Ні ў адным калгасе пры догглядзе за жывёлай ня ўведзена зьдзельшчына. У калгасе «Чырвоны трудавік» на сьвінагадоўчай фэрме **сьвіней дагледае хто хоча. ніякай адказнасьці за іх догляд няма.** Такое становішча характэрна для большасьці сьвінагадоўчых фэрм. Калгасьнікі зусім ня ведаюць заатэхмініму і тэхнікі догляду сьвіней. Гэтай справай ніхто ня кіруе. Вэтдоктара ў раёне няма.

Ва многіх калгасах таварная прадукцыя разбазарваецца. Плян здачы сьвіней выканан у раёне ўсяго **на 2,3 проц.**

Абвешчаны ЦК КП(б)Б ударны 2-месячнік па жывёлагадоўлі раённая партарганізацыя павінна ператварыць (у магутную зброю згуртаваньня калгасных мас вакол сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

С. Д.

Гародныя крамы гандлююць... сольлю

МАГІЛЕЎ. Кааператыў воднікаў правёў значную падрыхтоўчую работу **па** забесьпячэньні рабочых гароднінай. Былі складзены пляны патрэбы ў гародніне кожнага рабочага на год. Складзены пляны і па грамадзкім харчаваньні, але гэтыя пляны застаюцца на паперы. Воднікі павінны забясьпечвацца пладагароднінай па лініі Белпладагародніны ў цэнтралізаваным парадку. Ня гледзячы на дагавор і на ўсе магчымасьці адгрузіць гародніну, Белпладагародніна гэтага ня робіць і нават не дае нарадаў. Праўленьне ТСТ ня раз звярталася да кіраўнікоў Белпладагародніны аб адгрузцы прадукцыі, альбо ў крайнім выпадку дазвол загатоўкі яе самастойна, але ні таго ні другога не дабіліся. У выніку зрываецца плян загатоўкі і перапрацоўкі гародніны. У краме ТСТ акрамя яблык нічога няма. Замест гародніны крама загружана сольлю.

Ня зьнімаючы адказнасьці з праўленьня кааператыву воднікаў у справе забесьпячэньня рабочых гароднінай, трэба неадкладна дабіцца прадстаўленьня ТСТ нарадаў на адгрузку яе. Воднікі магілёўшчыны павінны быць забясьпечаны гароднінай.

Брыгада рабочых
Гаранін, Косыца, Майсейка.

1-я ўсебеларуская спартакіяда сацыялістычнага сэктару вёскі

25-га верасьня ў Менску адкрылася першая ўсебеларуская спартакіяда сацыялістычнага сэктару вёскі. У спартакіядзе прымаюць удзел 30 раённых каманд і асобныя фізкультурнікі ад іншых раёнаў.

Урачыстае адкрыцьцё адбылося ў дзяржаўным тэатры. З прывітаньнямі выступілі т. т.: **Рубінчык** (ЦК ЛКСМБ), **Малярэвіч** (ад саюзу сельгасрабочых), **Клімковіч** (ад бюро фізкультуры пры ЦСПСБ), **Камароў** (ад фізкультарганізацыі Украіны).

Ад рабочых фізкультурнікаў сталіцы спартакіядзе рапартавалі делегацыі фізкультурных каманд заводу **«Камунар»** і швейнай фабрыкі **«Кастрычнік».**

Ад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б спартакіяду вітаў тав. **Рыжоў.** Тав. Рыжоў падрабязна спыніўся на тых адказных задачах, якія ставіць партыя перад фізкультурным рухам, і выказаў упэўненасьць у тым, што ў другой усебеларускай спартакіядзе сацыялістычнага сэктару вёскі будуць прымаць удзел не адзінкі, а пагалоўна ўсе раёны. **«Гэтага, — кажа тав. Рыжоў,—мы павінны абавязкова дабіцца».**

БДТ-1 паставіў для ўдзельнікаў спартакіяды «Гуту».

Гародніну—пралетарскім цэнтрам

ГАРОДНІНА САМАЦЁКАМ НЯ ПОЙДЗЕ

Белкаапсаюз, Белкаапгародніна і Белсадсаюз[3] сваёй бясплянавасьцю дэзарганізуюць работу мясцовых кааперацыйных арганізацый.—У Віцебску і Гомелі тоны гародніны гніюць.—Правілы адсартаваньня і адкладкі агідна парушаюцца.—Нацэнкі вялікія.

Рэйд брыгад «Зьвязды» і віцебскай КК-РСІ выявіў поўную безьдзейнасьць віцебскіх кааперацыйных арганізацый у справе забесьпячэньня рабочых пладагароднінай. У гэтым галоўная прычына таго, што Віцебск адчувае недахват гародніны (бульбы і гуркоў).

Цэнтральныя арганізацыі, як **Белкаапсаюз, Белкаапгародніна і Белсадагародніна** ня толькі не садзейнічалі загатоўцы гародніны, але сваёй бясплянавасьцю і нераспарадчасьцю ўносілі блытаніну ў работу мясцовых кааперацыйных арганізацый.

Пачынаецца самы разгар копкі і загатоўкі бульбы, **а ВЦРК не забясьпечыў сябе патрэбнай тарай.** ВЦРК патрэбна 30.000 мяшкоў, а ёсьць толькі 5.000 штук.

Заключаныя дагавары з загатоўчымі кааперацыйнымі арганізацыямі выконваюцца недапушчальна марудна. Прыгарадныя гаспадаркі не засалілі 1.000 бочак гуркоў.

На складзе ВЦРК № 3 ніякага ўліку паступленьня і адпраўкі пладагародніны ў крамы няма. Прадукцыя рэалізуецца вельмі марудна. Вельмі часта гародніна адпраўляецца ў крамы несартаваная. Брыгадай, якая абсьледвала склад № 3, знойдзена **40 яшчыкаў папсаваных памідораў** і шмат згніўшай капусты ў той час, як у радзе крам памідоры адсутнічаюць. З усёй прадукцыі, якая знаходзіцца на складзе № 3, больш **50 проц. папсаванай.**

У ларку ВЦРК № 42 амаль уся прадукцыя гнілая. Вось ужо больш 5 дзён, як шмат гнілых яблык ляжаць разам з добраякаснымі, ад чаго павялічваецца псаваньне.

У краме ВЦРК № 172 брудна. Па ўсіх кутках гніль; яблыкі зусім дрэннай якасьці прадаюцца, як добрыя, па 75 к. кілёграм. Цэны на гнілыя памідоры ўстаноўлены, як за першы гатунак.

У краме ВЦРК № 177 не аказалася ў продажы буракоў і арбузоў у той час, як ЦРК гэтай прадукцыяй забясьпечан поўнасьцю.

Віцебскае аддзяленьне **Белкаапгародніны** працуе яшчэ горш, чым ЦРК. На базы Белкаапгародніна гародніна паступае бясплянава і як вынік такой «работы» памідораў накуплена шмат, вялікая колькасьць гніе, а бульбы зусім няма.

Дагавары з загатоўчымі арганізацыямі не заключаны. Дагавор ёсьць толькі з калгасам «Новы сьвет», але і гэты адзіны дагавор таксама ня выконваецца Тарай і гароднахавальнямі Белкаапгародніна не забясьпечана. Хаваньне пастаўлена дрэнна. Сартоўка амаль зусім не праводзіцца. **У выніку такой безгаспадарчасьці больш 2.000 кгр. памідораў згніло, але цэны на іх устаноўлены**, як за першы гатунак. Ня дзіва, што іх ніхто ня купляе. Амаль такое-ж становішча з яблыкамі. У ларках пануе поўная безгаспадарчасьць. Плян пашырэньня сеткі недавыканан на тры адзінкі.

У складах **ТСТ** брудна. Укладка памідораў робіцца абы як. Процант псаваньня гародніны вялікі.

У магазыне ТСТ № 2 уся морква аказалася згніўшай. Толькі адзін мяшок добраякаснай морквы знайшоўся за прылаўкам, які ў продаж не паступаў чамусьці. Цэны на памідоры ўстаноўлены 50 кап. кілё, замест 40 кап., яблыкі — 70 кап., у той час, як у іншых крамах такія яблыкі каштуюць 55 кап.

У магазыне ТСТ № 39 морква прадаецца па 18 кап. кілёграм, а ў іншых крамах 12 кап. У гэтай краме недапушчальна марудна праводзіцца прыёмка прадукцыі. Так, 25 вазоў з-за нерасьпарадчасьці работнікаў магазыну прастаялі цэлы дзень, пакуль здалі гародніну.

Дрэнна абстаіць справа і ў закрытым разьмеркавальніку фабрыкі «Дзьвіна». Цьвёрдых нарадаў на пладагародніну разьмеркавальнік «Дзьвіны» ня мае. З прыгараднымі гаспадаркамі дагавары не заключаны. У загатоўчых раёнах знаходзіцца толькі адзін брыгадзір, які з работай не спраўляецца.

13 верасьня з Рудакоўскага сельсавету быў накіраваны на фабрыку абоз з бульбай. Абоз налічваў 200 вазоў. Абозам кіраваў брыгадзір «Дзьвіны», але да фабрыкі абоз не даехаў і куды дзявалася бульба невядома. Работу брыгадзіра ніхто не правярае.

Цікава, што і тут пануе поўная блытаніна з цэнамі. Так, бульба 1 верасьня прадавалася па 13 кап. кілёграм, 4-та —12 кап., 8—6,3 кап., 13—5,7 кап., а 10 верасьня — 15 кап. клг. Такое-ж становішча з гуркамі.

Брыгада, якая абсьледвала ЗРК **«Дзьвіны»,** знайшла вельмі многа бракоўнай пладагародніны. Бракоўнай капусты знойдзена 480 кгр. яблык—40 кгр. арбузоў — 35 кгр. і шмат гнілых памідораў.

Па заяве саміх кіраўнікоў ЗРК існуючыя дагавары з загатоўчымі арганізацыямі, не забясьпечваюць запатрабаваньняў рабочых. Але праўленьне ня прымае ніякіх мер для самазагатоўкі пладагародніны.

Крыху лепш у **ЗРК панчошнікаў**, дзе дагавары на загатоўку пладагародніны заключаны своечасова. Але і **тут** ёсьць небясьпека, бо на месцы загатоўкі няма прадстаўніка ЗРК. Памяшканьне базы зусім прыгоднае для хаваньня пладагародніны, але няма складачных памяшканьняў пры магазынах і сталоўцы. Не хапае таксама тары — каля 4 тыс. мяшкоў. Псаванай прадукцыі амаль няма; хаваньне яе пастаўлена добра.

Амаль у такім-жа становішчы знаходзіцца **ЗРК швэйнікаў і воднікаў.**

Работа ў чытуначным пакгаўзе ідзе па-ўдарнаму. Выгрузка з вагонаў і пакгаўзаў праходзіць без затрыманьня. Брыгадай выяўлен вагон арбузоў, які прыбыў на адрас ВЦРК і знаходзіцца ў пакгаўзе з 16 верасьня, але ВЦРК не мусьці адмаўляецца яго выкупіць. Некалькі дзён на станцыі знаходзіцца вагон з памідорамі і яго таксама ня выкупляюць. Прыбыўшыя 13 верасьня тры вагоны з гуркамі па распараджэньні работнікаў ВЦРК выгружаліся без усякай пераборкі, проста лапатамі, з-за чаго вялікая колькасьць гуркоў папсавалася.

Усе гэтыя факты, выяўленыя рэйдам «Зьвязды» і гарКК-РСІ, зусім выразна гавораць аб тым, што некаторыя віцебскія кааперацыйныя арганізацыі, асабліва **ВЦРК**, які забясьпечвае 75.000 чалавек, і віцебскае аддзяленьне **Белкаапгародніны** не падрыхтаваліся да загатоўкі і завозу пладагародніны, што з боку раду работнікаў кааперацыйных арганізацый адчуваецца нядбайнасьць, безгаспадарчасьць, якая мяжуе са шкодніцтвам.

Гар-КК-РСІ і пракуратура павінны безадкладна прыцягнуць да судовай адказнасьці падрыўшчыкаў рабочага забесьпячэньня. Вінаватыя ў перабоях з забесьпячэньнем віцебскіх рабочых пладагароднінай павінны атрымаць заслужаную кару.

Брыгада «Зьвязды» і віцебскай гарКК-РСІ:
Арк. Зарубежны, Макараў, Шчаглоў, Хадзякоў, Бардоўскі, Саламаха, Падзерына, Карашцін, Парфяновіч, Іваў, Крыштановіч, Няўзораў, Казлоўскі, Шэўчэнка, Кураноў, Мосьнін, Гуйчын, Кузьмін, Куратнікаў, Прыбыльскі, Бальковіч, Дзягілеў.

Уборка не разгорнута

У саўгаснай сталоўцы на рабочых—6 лыжак. Грошай няма, а бульба не рэалізуецца

ГОМЕЛЬ. Забесьпячэньне рабочых Гомелю гароднінай усё яшчэ праходзіць нездавальняюча. Некаторыя кааператары не навучыліся па-савецку гандляваць, не зацікаўлены гароднінай і забясьпячэньнем ёю пралетарыяту гораду. Але справа ня толькі ў кааператарах. Ня лепш пастаўлена работа ў прыгараднай гаспадарцы ЦРК. Дырэктар саўгасу Хатылеў, яго намесьнік, сакратар партячэйкі саўгасу і аграном паказваюць брыгадзе друку плян уборачнай кампаніі. Трэба ўбраць 180 гэкт. бульбы, 22 гэкт. фасолі, 20 гэкт. памідораў, 20 гэкт. гуркоў, 36 гэкт. морквы, 84 гэкт. буракоў, звыш 80 гэкт. капусты, 20 гэкт. турнэпсу і шмат іншага. Для ўборкі патрабуецца 18.234 тысячы рабочых дзён, або 600 чалавек штодзенна.

У той час, як паміж брыгадзірамі і адміністрацыяй саўгасу вядзецца гутарка аб мабілізацыі рабочых вучняў для работы на гародзе, у пакой уваходзіць рабочы саўгасу і дае загадчыку гаспадаркай пісульку наступнага зьместу:

«Тав. Судвель. Сеньня працуюць на гародзе 200 рабочых Гомсельмашу, а ў сталоўцы ёсьць усяго 6 лыжак. Як-жа будзе з абедам?»

Ці ведала адміністрацыя, што сёньня будзе працаваць 200 чалавек? Аказваецца, што ведала. Ведалі таксама і аб тым, што ў сталоўцы ўсяго 6 лыжак.

— Але што мы маглі зрабіць, — кажуць кіраўнікі саўгасу, — ня можна нідзе дастаць лыжак(?).

Калі брыгада прыехала на вучастак, удзельнікі яе былі сьведкамі агіднейшага факту — 200 рабочых плюс 100 вучняў абедалі... шасьцю лыжкамі на працягу трох гадзін. Ці можна сабе ўявіць больш абураючае становішча, калі рабочыя аддаюць свае выходныя дні на работу ў гародах, а іх прымушаюць стаяць у чарзе па 3 газіны за абедам.

Калі запыталіся ў Гомхарчы, ці ёсьць у іх лыжкі, апошні прадставіў для саўгасу 500 лыжак.

Пастаянных рабочых у саўгасе ёсьць 200 чалавек, але за апошні час назіраецца вялікая цякучасьць. Рабочым своечасова ня выплачваецца зарплата; у інтэрнатах цесна і брудна. Напружанае фінансавае становішча саўгасу поўнасьцю вынікае з яго «умелай» работы па рэалізацыі ураджаю. Трэба адзначыць, што ранняя бульба ў колькасьці 80 гэкт. павінна была быць рэалізавана паўтара-два месяцы назад. Бульба да гэтуль не рэалізавана. Вельмі дзіўна тое, што дырэктар саўгасу ня ведаў аб тым, што па бюджэту горсаветам асыгнавана саўгасу 110.000 руб.

У саўгасе ёсьць памідоры, гуркі, капуста, а ў горадзе гародніны не хапае.

Дырэктар саўгасу гаворыць, што нібы базы ГЦРК і ЗРК ня хочуць браць гародніны і таму саўгас прадае яе на прыватным рынку, або адпраўляе ў іншыя гарады. Былі нават выпадкі, калі гародніну адпраўлялі назад у саўгас. Гэта прымусіла брыгаду склікаць пры рэдакцыі «Палескай Праўды» нараду кіраўнікоў саўгасу, загадчыкаў баз і загадчыкаў крам разам з прадстаўнікамі пяцёркі гаркому партыі.

На нарадзе выявілася, што загадчыкі баз сапраўды не жадаюць браць гародніну з саўгасу, таму што яна дрэннай якасьці. Па інструкцыі яна, быццам, паступае правільна, а па сутнасьці — гэта зьдзек над рабочым спажыўцом.

Ні адзін загадчык базы не палічыў патрэбным зьявіцца ў саўгас і там адабраць тое, што яму трэба, адкінуўшы ўсё непатрэбнае. Загадчыкі чакаюць — прывязуць гародніну — добра, а не прывязуць — яшчэ лепш, менш шклапаціцца трэба.

Такому чыноўніцкаму падыходу з боку асобных кааператараў павінен быць пакладзен канец.

Мы прапануем максымальна паскорыць прасоўваньне гародніны ад гароду да спажыўца. Загадчыкі магазынаў павінны зьвязацца непасрэдна з саўгасам для атрыманьня гародніны.

Неабходна мець на гародах прадстаўніка ад усіх гандлёвых арганізацый для таго, каб на месцы адбіраць гародніну добрай якасьці.

Безадкладна распачаць выплату зарплаты рабочым гораду гароднінай за адпрацаваныя выходныя дні, даставіўшы ЗРК для гэтай мэты неабходную колькасьць прадукцыі.

У самы найкарацейшы тэрмін перабудаваць работу саўгаснай сталоўкі.

Заўкомам прыцягнуць усіх рабочых да ўборкі прымацаваных да прадпрыемстваў гародаў, разгарнуць сацспаборніцтва на хутчэйшую і лепшую ўборку.

Брыгада «Палескай Праўды», «Зьвязды» і «Акцябра»: **Зэльманаў, Рубжын, Кручко, Баруховіч, Рабіновіч, Негінскі.**

Манэўры часьцей РСЧА

БАЙЦЫ СПАБОРНІЧАЮЦЬ

на лепшае выкананьне баявых заданьняў

Узорную работу паказваюць авіяцыя і кавалерыйскія часьці

Сотнямі заяў у партыю, і ў камсамол адзначаюць чырвонаармейцы, рабочыя і працоўныя дні манэўраў

Мацнее сувязь калгасьнікаў з Чырвонай арміяй

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23. (Спэцкор БЕЛТА). Зараз праходзіць трэці этап манэўраў. Байцы і камандзіры вырашаюць складанейшыя задачы, правяраючы на практыцы вынікі летняй вучобы.

Але побач з асноўнай задачай—баявой вучобай—увесь склад манэўруючых часьцей прымае актыўны ўдзел у рабоце мясцовых арганізацый, дапамагаючы апошнім у выкананьні асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі. На прывалах і начлегах байцы, палітработнікі і камандзіры арганізуюць сходы, праводзяць гутаркі з калгасьнікамі, беднякамі і серадняками — аднаасобнікамі. Праведзеная работа дае значныя вынікі. Часта можна ўбачыць, як да здатачных пунктаў сьцякаюцца абозы ў 75-150 фурманак са збожжам і бульбай

Калгасьнікі са свайго боку шмат у чым дапамагаюць манэўруючым часьцям. Так, напрыклад, 22 верасьня 25 калгасьнікаў зьявіліся да камандаваньня №-скай дывізіі і прапанавалі бяз усякай аплаты сваю дапамогу ў правядзеньні розных работ.

Так практычна на палёх манэўраў мацнее сувязь паміж калгасьнікамі і Чырвонай арміяй.

На манэўрах. растлумачэньне баявой задачы.

Калгасьнікі дапамагаюць чырвоным байцом

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 25. (СПЭЦКОР БЕЛТА). ЗВЫШ 100 КАЛГАСЬНІКАЎ З ВЁСКІ К. У ДОБРААХВОТНЫМ ПАРАДКУ ДАПАМАГАЛІ Ў РАБОТАХ №-СКАГА ПАЛКА. РАБОТЫ ВЯЛІСЯ ПАД БЕСЬПЕРАПЫННЫМ ДАЖДЖОМ. НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ГЭТА, ПРАЦА ВЫКАНАНА ЯК У КОЛЬКАСНЫХ, ТАК І Ў ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ, ВЕЛЬМІ ДОБРА.

* *

РАЁН МАНЭЎРАЎ. ФУРМАНШЧЫКІ (КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ), ЯКІЯ БЫЛІ НАНЯТЫ ДЛЯ ПЕРАВОЗКІ МАЕМАСЬЦІ №-СКАЙ КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ДЫВІЗІІ, ПРАЯЎЛЯЮЦЬ ДОБРАСУМЛЕННЫЯ АДНОСІНЫ ДА РАБОТЫ І ВЯЛІКУЮ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ДА МАНЭЎРАЎ. ЗВЫШ 70 ПРОЦ. ФУРМАНШЧЫКАЎ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У СПАБОРНІЦТВЕ З ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМІ НА ЛЕПШУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ РУХУ, НА ЛЕПШЫ ДОГЛЯД КАНЯ І ЗАХАВАНАСЬЦЬ МАЕМАСЬЦІ ПРЫ ПЕРАВОЗКАХ. НЯДАЎНА ПРЫ ЧАРГОВАЙ ЗЬМЕНЕ ФУРМАНШЧЫКАЎ 12 ЧАЛАВЕК АДМОВІЛІСЯ ЗЬМЯНЯЦЦА: «МЫ ЖАДАЕМ БЫЦЬ БАЙЦАМІ ДА КАНЦА МАНЭЎРАЎ» — ЗАЯВІЛІ ЯНЫ І ЗАСТАЛІСЯ ПРЫ ЧАСЬЦІ.

Бліскучыя ўзоры баявой работы эскадрона

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 25. (Спэцкор БЕЛТА). Эскадрон пад камандай тав. СЯРГЕЕВА атрымаў заданьне — правесьці разьведку. Эскадрон дзейнічаў у шырокай паласе (ад 4 да 6 кілёмэтраў), што патрабавала ад камандзіраў вялікай ініцыятывы, здагадлівасьці, ад байцоў нястомнасьці ў баявых дзеяньнях.

Актыўным правядзеньнем разьведкі эскадрон выкрыў «праціўніка», раптоўнай атакай ён «разьбіў» стралковую, кулямётную, сапёрную роты і батарэю «праціўніка», захваціў абоз і штаб стралковага батальёна разам з важнымі апэрацыйнымі дакумэнтамі. Пазьней у другім раёне былі захвачаны таксама апэрацыйныя дакумэнты.

У часе разьведкі, ня гледзячы на дрэннае надвор'е і цяжкія ўмовы перасоўваньня па пясістай і забалочанай мясцовасьці, байцы працавалі па - ўдарнаму. Знаходзячыся ў разьведцы, эскадрон увесь час праз «фронт» трымаў сувязь з камандаваньнем палка.

У наступны дзень эскадрон тав. СЯРГЕЕВА, будучы ва ўдарнай групе палка, правёў контр - атаку левага і правага флянгу «праціўніка», чым дапамог усяму палку выканаць баявую задачу.

Камандаваньне палка за ўзорную баявую работу абвясьціла падзяку ўсяму чырвонаармейскаму і начальніцкаму складу эскадрона. Апрача таго асобныя чырвонаармейцы - ўдарнікі прадстаўлены да грашовай узнагароды.

Прывал.

Рапарт шэфам

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор БЕЛТА). №-скі чырвонасьцяжны кавалерыйскі полк, адзін з лепшых палкоў дывізіі, паслаў сваім шэфам—прадпрыемствам—наступны рапарт:

«Задачы манэўраў полк выконвае па-ўдарнаму. Дні манэўраў паказалі высокае палітычна - маральнае становішча байцоў і начскладу. Байцы дэманструюць ўзоры ўдарнай бальшавіцкай работы. Адзначаем работу т. т. ЗОТКІНА, СЯРГЕЕВА, КОБА, ЛЯЎЧУКА, ЗАВІРУЙКА і іншых.

За час манэўраў у партыю падана 57 заяў, у камсамол — 19, у калгасы —7. Полк растлумачвае працоўнаму насельніцтву задачы манэўраў, вядзе масавую работу вакол пытаньняў ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Сяляне адказваюць на манэўры арганізацыяй чырвоных абозаў, уступленьнем у калгасы.

Байцы і начсклад запэўняюць шэфаў, што пад кіраўніцтвам партарганізацыі і камандаваньня полк узорна выканае пастаўленыя перад ім задачы.

Не жадаем заставацца ў „праціўніка“

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (БЕЛТА). №-СКІ ПОЛК ПАСЬЛЯ БОЮ З НАСТУПАЮЧАЙ ПЯХОТАЙ «ПРАЦІЎНІКА» БЫЎ ВЫМУШАН ЧАСОВА ПАКІНУЦЬ ВЁСКУ С. МОЛАДЗЬ ВЁСКІ НЕ ПАЖАДАЛА ЗАСТАЦЦА Ў РУКАХ «ПРАЦІЎНІКА» І АДСТУПІЛА РАЗАМ З ПАЛКОМ. ПАСЬЛЯ ЗВАРОТУ ПАЛКА Ў ВЁСКУ МОЛАДЗЬ ПРЫМАЛА АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У РАБОЦЕ ЧАСЬЦІ. БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЁСКІ Ў СУВЯЗІ З МАНЭЎРАМІ АРГАНІЗАВАЛІ З ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ.

Авіяцыя на манэўрах

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор БЕЛТА). Трэці этап манэўраў паказаў новыя вялікія дасягненьні авіяцыі абодвух бакоў. Чырвоная авіяцыя вельмі добра справілася з задачай разьведваньня групоўкі сіл «праціўніка» і работ па ўмацаваньні абарончай паласы «сініх».

Складаны малюнак выяўлялі штурмавыя дзеяньні авіяцыі па конніцы «праціўніка». Зьнішчыцелі суправаджалі разьведчыкаў, выкрылі і атакавалі аэрадром «сініх».

23-га верасьня авіяцыя чырвоных забясьпечыла энэргічнае наступленьне войск, абараняючы іх ад авіяцыі «праціўніка». Уночы вялася ўзмоцненая разьведка ўмацаванай паласы і шляхоў зносін у тыле «сініх», пасьля чаго яна разбурала іх бамбардаваньнем

Гэтыя дні авіяцыя працавала ў выключна цяжкіх умовах надвор'я пры тумане і дажджох. Ня гледзячы на гэта, разьведка давала каштоўныя весткі аб перагрупоўцы «праціўніка» аб складзе часьцей.

Галоўны кіраўнік манэўраў тав. **Убарэвіч**, ацэньваючы работу авіяцыі, сказаў: «Работа авіяцыі абодвух бакоў цалкам здавальняючая. Добра правялі атакі зьнішчыцелі, вельмі добра арганізаваны атакі на наземныя войскі. Патрэбна яшчэ большая тактычная граматнасьць лётнага складу».

Год выданьня—XV
№ 263 (4116)
Нядзеля, 27 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Бел. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27, сакратар—10-74, партсектар—13-80, прамысл.—13-80, сап. эканом.—6-19, масц.інфарм.—6-19, эканом. інфарм.—6-19, начны рэдактар—5-42, міжнародны інфар.—13-74, кантора выдавецтва—7-81

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ ЗМАГАРЫ СТОИКА І ГЕРАІЧНА

ВОСЬМЫ ДЗЕНЬ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ГАЛАДОЎКУ

Турэмшчыкі, імкнучыся зламаць галадоўку, ўжываюць гвалтоўнае „штучнае кармленьне“. Карцэры напоўнены зьбітымі палітвязьнямі. Масавае „уціхамірваньне“ вадой. Палітвязьняў рассаджваюць ў камэры крымінальных.

Усе сілы—на абарону жыцьця галадаючых палітзьняволеных

ВАРШАВА, 25. Польскі друк поўны паведамленьняў аб масавых арыштах сярод рэвалюцыйных рабочых. За апошнія дні ў адной толькі Варшаве арыштавана каля 50 рабочых па падазрэньні ў камуністычнай дзейнасьці. Масавыя арышты праведзены таксама і ў правінцыі.

У Беластоку быў арыштаваны бяз усякага повада рабочы-кравец І. Б. Ужо ў сябе на кватэры ён быў зьбіты да страты прытомнасьці. Вобыск нічога ня даў, тым ня менш ён быў адпраўлен у ахранку, дзе яго безчалавечна зьбівалі, дабіваючыся ад яго прызнаньня, што ён член кампартыі. Зьбітага, апухшага, харкаючага крывёю беспартыйнага рабочага, які ні ў чым ня прызнаўся, ахраньнікі адправілі ў шпіталь, дзе ён даведаўся, што там нядаўна загінулі тры палітзьняволеных у рэзультаце катаваньняў.

Палітзьняволеныя ва ўсіх турмах пераведзены на крымінальны рэжым. У іх адабрана права на арганізацыю харчовых камун, права сумесных прагулак, пакупкі кніг, папярос, у іх адабраны бібліятэкі і г. д. У Пінскай турме адміністрацыя пасадзіла палітзьняволеных з крымінальнымі, якія тэрарызуюць палітзьняволеных. Сярод палітзьняволеных у Беластоцкай турме многа цяжка хворых туберкулёзам. Яны пазбаўлены мэдычнай дапамогі.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ ВЯДУЦЬ НЕПАХІСНУЮ, ГЕРАІЧНУЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ГВАЛТАЎ НАД ІМІ, ЖОРСТКА АДСТОЙВАЮЧЫ СВАЕ ПРАВЫ. УСЕАГУЛЬНАЯ ГАЛАДОЎКА ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ УСЁ ЯШЧЭ АДБЫВАЕЦЦА. СУПРОЦЬ БАРАЦЬБЫ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ ЎЖЫВАЮЦЦА ЎСЕ СРОДКІ ПАЛІЦЭЙСКАГА СВАВОЛЬЛЯ — ЗАБОЙСТВЫ, ЗЬБІЕНЬНІ, ШТУЧНАЕ КАРМЛЕНЬНЕ, УСЬМІРЭНЬНЕ ВАДОЙ І Г. Д.

ШТОРМ ПРАТЭСТУ І ГНЕВУ

23 верасьня ў Воршы адбыўся вялікі інтэрнацыянальны вечар салідарнасьці з барацьбой 10.000 палітзьняволеных польскіх турмаў.

Вечар быў арганізаваны РК МОПР'у сумесна з партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Спаткаены бурным воплескамі **б. генэральны сакратар Беларускай Рабоча-Сялянскай Грамады т. Бурсэвіч,** які доўгі час прасядзеў у розных турмах беланольскай Польшчы, расказаў аб становішчы палітзьняволеных і аб іх салідарнай барацьбе — **усеагульнай галадоўцы.**

У прынятых рэзалюцыях гаворыцца:

«Польскі фашызм, пры актыўнай дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў, крывава расправляецца з нацыянальна-вызваленчым рухам рабоча-сялянскіх мас Заходняй Беларусі, імкнецца ў крыві затапіць увесь рэвалюцыйны рух, каб такім чынам забясьпечыць сабе тылы на выпадак вайны з СССР, да якой ён няўхільна рыхтуецца.

Імянна з мэтай душэньня рэвалюцыйнага руху, уведзены ва ўсёй краіне **ваенна-палявыя суды,** з гэтай мэтай у турмах 10.000 зьняволеных рэвалюцыянэраў пераведзены **на крымінальны рэжым,** што зьяўляецца па сутнасьці асуджэньнем іх на павольнае выміраньне.

Але як і трэба было спадзявацца, фашызм спаткаў належны адпор з боку загартаваных барацьбітоў рэвалюцыі — палітзьняволеных. Палітзьняволеныя салідарна ўзьнялі сьцяг усеагульнай галадоўкі.

Вітаючы гераічную барацьбу зьняволеных братоў, мы патрабуем безадкладна зьвярнуць палітзьняволеным іх правы, **спыніць зьдзекі над імі.**

Працоўныя **Аршаншчыны** ў адказ на белы тэрор польскага фашызму, абавязуюцца сабраць **17.000 руб. у фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным** і іх сем'ям абавязуюцца аддаць усе свае сілы для пераможнага завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай экономікі ў гэтым годзе.

Няхай жыве салідарная барацьба палоньнікаў польскага фашызму.

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік».

**

Пашыраная нарада **актыву Вітуніцкага сельсавету Бягомльскага раёну** выказвае свой рашучы пратэст супроць уведзеньня ў турмах Польшчы **крымінальнага рэжыму для палітзьняволеных.** Дамагаемся зараз-жа скасаваць гэты нячуваны ў гісторыі закон. Здабытыя крывёю правы палітзьняволеных павінны быць ім безадкладна зьвернуты.

У адказ польскім фашыстам актыў сельсавету абавязваецца аддаць усе свае сілы на выкананьне гаспадарча-палітычных задач і абавязуецца разгарнуць на вёсках самую шырокую кампанію па зборы матар'яльнай дапамогі палітзьняволеным.

Актыў сабраў на нарадзе ў фонд дапамогі палітзьняволеным 50 р. У гэты-ж фонд мясцовая ячэйка МОПР'у ўнесла апрача таго 23 руб.

**

Рабочыя заводу **«Інтэрнацыянал»** (Рэчыца) салідарызуюцца з барацьбой палітзьняволеных польскіх турмаў і дамагаюцца спыніць зьдзекі над зьняволенымі братамі.

У адказ польскім фашыстам рабочыя адлічаюць 1 проц. месячнага заработку на карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў.

**

Агульны сход **рабочых і служачых мяса-камбінату (Ворша)** далучаецца да шматмільённага пратэсту супроць разгулу белага тэрору ў турмах Польшчы і ва ўсёй краіне.

У знак салідарнасьці з барацьбой палітзьняволеных, рабочыя бяруць на сябе абавязак яшчэ больш рашуча змагацца за выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, бяруць на сябе абавязак ўзмацніць дапамогу палітзьняволеным, высоўваючы сваю сустрэчную **лічбу зімовай дапамогі ў суме 300 р.**

**

Агульны сход **супрацоўнікаў кантory і складу Белгандлю** ганьбіць фашысцкі ўрад Польшчы, які ўвёў у сваіх турмах нябачанае ў гісторыі зраўнаньне ў правах палітзьняволеных з крымінальнымі злачынцамі.

— **Дарагія таварышы,** палітзьняволеныя! Мы пільна **сочым за вашай барацьбой і заўсёды гатовы вам дапамагчы.**

У адказ вашым катам мы цяпер адлічваем у фонд дапамогі вам і вашым сем'ям **2 проц. свайго месячнага заработку.**

Будзьце непахіснымі ў барацьбе і ведайце, што недалёка той час, калі рабочыя і сяляне Польшчы разьлічацца з вашымі катамі.

„Няхай наш голас пратэсту прагрыміць на ўвесь сьвет!“

Адозва Цэнтральнага Камітэту МОПР'у БССР да ўсіх працоўных, да ўсіх членаў МОПР'у БССР

Дарагія таварышы!

10.000 палітзьняволеных, якія сядзяць у турмах Польшчы, змагаюцца не на жыцьцё, а на сьмерць з польскім фашызмам супроць зьверскіх катаваньняў, супроць новага фашысцкага турэмнага рэгляманту, супроць уводзеньня палявых судоў і вечнай катаргі для рэвалюцыянэраў, за вызваленьне ўсіх працоўных Польшчы ад дыктатуры Пілсудзкага, ад голаду, крыві і вайны.

10.000 палітзьняволеных Польшчы абвясьцілі агульную галадоўку. 7 дзён ужо цягнецца гэта галадоўка. Патрэбна хуткая і самаахвярная дапамога і абарона жыцьця палітзьняволеных Польшчы.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР яшчэ раз заклікае ўсіх працоўных, усіх членаў МОПР'у Савецкай Беларусі мабілізавацца на абарону жыцьця палітзьняволеных Польшчы, яшчэ больш узьняць свой голас пратэсту, выказаць свой пралетарскі абавязак салідарнасьці з рэвалюцыйнымі барацьбітамі Польшчы ў часе іх цяжкой і няроўнай барацьбы з азьвярэлымі катамі фашысцкай дыктатуры Польшчы. Гэта — наш абавязак. Гэтага патрабуюць ад нас нашы браты па класе—рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне Польшчы. Да нас працягваюць рукі 10 тысяч палітзьняволеных Польшчы.

Усе на дапамогу палітзьняволеным фашысцкай Польшчы! Усе да аднаго хто разумее цяжкую барацьбу рэвалюцыянэраў, усе да аднаго, хто разумее небясьпеку, якая пагражае палітзьняволеным, галадаючым восьмы дзень у знак пратэсту супроць крывавага рэжыму ў турмах, супроць забойстваў рэвалюцыянэраў у турмах, супроць палявых судоў і вечнай катаргі — павінны неадкладна мабілізавацца, выступіць з пратэстам, дэманстраваць сваю волю да барацьбы з фашызмам, да ўзмацненьня дапамогі палітзьняволеным.

Няхай наш голас пратэсту прагрыміць яшчэ з большай сілай на ўвесь сьвет.

Няхай ведаюць фашысты, што працоўныя БССР гатовы грудзьмі абараняць жыцьцё нашых братоў, рэвалюцыйных рабочых і сялян Польшчы і Зах. Беларусі.

ЦК МОПР'у БССР заклікае ўсіх працоўных неадкладна праверыць, як выконваюцца абавязкі, прынятыя на агульных сходах-пратэсту па дапамозе палітзьняволеным Польшчы, бо толькі матар'яльнай і маральнай дапамогай можна выратаваць рэвалюцыянэраў Польшчы ад галоднай сьмерці.

Лепшым адказам на зьверствы фашызму, лепшым доказам пралетарскай салідарнасьці будуць бальшавіцкія тэмпы працоўных на выкананьні пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, мабілізацыі ўсёй мопраўскай арганізацыі на дапамогу партыі і ўраду ў рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы», што павінна ўзмацніць магутнасьць пралетарскай краіны і сацыялістычнае будаўніцтва.

Усе сілы, усю энэргію на дапамогу рэвалюцыянэрам Польшчы!

Ад імя ўсёй арганізацыі МОПР'у БССР Цэнтральны Камітэт МОПР'у шле гарачае прывітаньне ўсім палітзьняволеным Польшчы. Працоўныя БССР яшчэ з большай напружанасьцю ўзмацняць сваю вайсковую падрыхтоўку, каб быць гатовым да абароны пралетарскай бацькаўшчыны ад пагрозы вайны.

Прэч дыктатуру фашызму, якая зьнішчае лепшых барацьбітоў рэвалюцыі!

Няхай жыве і мацнее рэвалюцыйная барацьба палітзьняволеных Польшчы з фашысцкім рэжымам.

Няхай жыве і мацнее міжнародная пралетарская салідарнасьць у барацьбе з фашызмам!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы і Зах. Беларусі — правадыр надыходзячай пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы!

Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР.
26 верасьня.

Забастоўка рабочых тэкстыльных фабрык Н'ю-Джарсі (ПАЗШ). На здымку: арышт забастоўшчыка

Мірныя запэўненьні—пад акампанімэнт батарэй

БЭЙПІН, 24. Як паведамляюць з Харбіна, усе кітайскія чыгункі ў Манчжурыі знаходзяцца цяпер ў веданьні японцаў і кіруюцца адміністрацыяй Паўднёва-Манчжурскай чыг. Сьледам за Сілінгай — Таонаньскай чыгункай у сучасны момант акупуецца Таонань — Ціцікарская чыгунка з радам пунктаў унутранной Манголіі. Паўночны вучастак Бэйпін — Мукдэнскай дарогі таксама заняты японскімі войскамі. Грузавыя і пасажырскія зносіны спынены. Пошта накіроўваецца праз Дайрэн. Паводле кітайскіх паведамленьняў, японскія ўлады падрыхтоўваюць пабудову Кірын-Хойрэнскай дарогі.

БЭЙПІН, 25. Як паведамляюць з Харбіна, японскія ўлады, карыстаючыся перыядам акупацыі, праводзяць, асабліва ў Карэйскай правінцыі, расправу з антыімпэрыялістычнымі рэвалюцыйнымі элемэнтамі. У прыватнасьці яны праводзяць палітзьняволеных карэйцаў з кітайскіх турэм у Карэю.

**

БЭЙПІН, 25. Паведамляюць з Харбіна, 24-га верасьня ў акрузе Цаяндао, Кірынскай правінцыі, розныя раёны якога заняты японскімі войскамі, выбухнула забастоўка гарнякоў мясцовых японскіх вугальных капаленьняў. Забастоўка носіць яркі палітычны характар і праходзіць пад знакам пратэсту супроць акупацыі, а таксама супроць кітайскіх мілітарыстаў.

**

ЖЭНЕВА, 25. Апублікавана адказная нота японскага ўраду Лізе Нацый. У ноце паказваецца, што японскія войскі дзейнічаюць толькі ў рамках забесьпячэньня бясьпекі. Японскі ўрад выказвае ў ноце рашучасьць наладзіць справу шляхам простых перагавораў з Кітаем і паведамляе, што адвод войск будзе праводзіцца па меры палягчэньня становішча.

Японская нота Лізе Нацый расцэньваецца, як сур'ёзны ўдар па «прэстыжы» Лігі. Калі высьветлілася спрыяючая для Японіі пазыцыя Францыі, японская дэлегацыя зусім перастала саромецца савету Лігі Нацый.

Амэрыканская паліцыя разганяе забастаўшых тэкстыльшчыкаў

Паліцэйскі налёт на „Дэйлі Уоркер“

ЛЁНДАН, 26. Паліцыя зрабіла налёт на памяшканьне органу кампартыі «Дэйлі Уоркер», арыштавала загадчыка выдавецкай часткі і шукала трох другіх асоб, адказных за выданьне газэты. Паліцэйскія правадзілі вобыск на працягу трох гадзін. Канфіскавана вялікая колькасьць экзэмпляраў газэт і карэспандэнцый. Потым паліцыя працэнзавала ўвесь тэкст газэты, выкрэсьліла ўсе напамінаньні аб падзеях ва флёце, мяняла загалоўкі і г. д. Сёньня загадчыку выдавецкай часткі будзе прад'яўлена абвінавачаньне «ў падбухторваньні да мецяжу».

Фунт бесьперапынна коціцца ўніз

ЛЁНДАН, 25. Фунт стэрлінгаў працягвае імкліва падаць. Сёньня днём фунт каштаваў на Нью-Ёрскай біржы толькі 14 шылінгаў (фунт — 20 шылінгаў). За адзін дзень фунт зьнізіўся амаль на 2 шылінгі. На эўрапэйскіх біржах курс фунта некалькі вышэй — хістаецца паміж 14 шылінгамі 2 пенсамі і 14 шылінгамі 8 пенсамі.

—200 зьняволеных у турмы ў горадзе Враца (Баўгарыя) абвясьцілі галадоўку пратэсту супроць жорсткага турэмнага рэжыму (ТАСС).

Дэманстрацыя гарнякоў у Віргініі (ПАЗШ) супроць высяленьня з кватэр

„Мы—з мяцежнымі маракамі“—заяўляюць рабочыя Англіі

ЛЁНДАН, 25. Морскія ўлады выкарыстаюць час да кастрычніка калі будуць аднаўлены манэўры флёту для склікаьня мітынгаў матросаў, на якіх апошнім «растлумачваюць» неабходнасьць зьніжэньня ставак.

Падзеі ва флёце выклікаюць энтузіязм сярод рабочых. У часе дэманстрацыі і мітынгаў усякае ўспамінаньне аб падзеях ва флёце выклікае бурныя ўхваленьні рабочых. Усюды прымаюцца рэзалюцыі аб салідарнасьці з маракамі.

Дзьверы бірж зачынены

СТАКГОЛЬМ, 25. **Біржа ў Стакгольме закрыта да канца тыдня.** У сувязі з цяжкім фінансавым становішчам «Сьвеска Дагбладэс» дамагаецца зьніжэньня зарплаты і выказваецца за захаваньне залатога парытэту. «Стакгольм Дагблад» усё яшчэ абараняе сваю пазыцыю скасаваньня залатога стандарту. Дырэктар буйнейшага банку «Стакгольм Энгшылда Банк Валенбэр выехаў у Парыж, згодна паведамленьня газэт, у сувязі з фінансавым крызісам і па даручэньні рэйхсбанку.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВ. ЗОРКА“ Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм **Пуцёўка ў жыцьцё** драма ў 34 эпізодах.

„КУЛЬТУРА“ Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы мастацкі яўрэйскі фільм **Чалавек з мястэчка**

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм **ЛУНА ЗЬЛЕВА** Звыш. прагр. хроніка Саюзкіно

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкая бытавая драма ў 6 частках **ВАСІЛІНА** Звыш прагр. хроніка Саюзкіно №3

„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) — **СІНІЯ КАЎНЯРЫ** кіна-повесьць у 5 частках. Пач. у 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня

„СПАРТАК“ Пач. 7-15, 9 і 10-45 Каса адкрыта з 5 г. — Мастацкі фільм **СІМБА** у 6 частках.

З 1 КАСТРЫЧНІКА г. г.
пры Койданаўскай Беларускай ШКМ
АДКРЫВАЮЦЦА АДНАГАДОВЫЯ
ПЭДАГАГІЧНЫЯ КУРСЫ.
Прыём заяў праводзіцца з 20 па 30 верасьня. Курсанты будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.
Койданаўскія пэдкурсы.

ВЯЧЭРНІ КАМВУЗ паведамляе ўсіх новапрынятых студэнтаў на 1-шы курс ВКУ, што сход студэнтаў адбудзецца **30 верасьня,** у 7 г. веч., у актавай залі КУБ.
Заняткі на першым курсе пачнуцца з 1 кастрычніка на ўсіх аддзяленьнях у памяшканьні першай 7-годкі па Інтэрнацыянальнай, № 31.
ВКУ.

1 КАСТРЫЧНІКА г. г. СКЛІКАЕЦЦА
па-зачарговы пашыраны пленум цэнтральнага праўленьня саюзу Белпрацасьветы.
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Вынікі VI па-зачарговага пленуму ЦК працасьветы (дакл. ад ЦК саюзу). 2) Даклады ЦП саюзу і НКАсьветы аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. 3) Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі.
Адкрыцьцё пленуму—1 кастрычніка ў 6 гадз. веч.
На пленум павінны абавязкова зьявіцца члены і кандыдаты пленуму і старшыні Гаррайпраўленьняў саюзу, а таксама старшыні Менскіх ГК, МК і прафкомаў.
Запрашаюцца прафактыў г. Менску і менскія асьветнікі-ўдарнікі.

Для складаньня вытворчага пляну работ на 1932 год па буравых шахтных студнях і вадаправоду
„БЕЛВОДТРЭСТ“
АБВЯШЧАЕ, ШТО ДА 15-Х г. г.
ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ
на гэту работу ад зацікаўленых арганізацый.
Пасьля паказанага тэрміну заяўкі прымацца ня будуць.
Вышукальнае будаўніцтва па бурэньні трэст ня прымае.
Заяўкі дасылаць па адрасе: МЕНСК, СТАРАЖОЎСКАЯ ВУЛ. Д. № 11, „БЕЛВОДТРЭСТУ“.

АРГМАСАВЫ СЭКТАР МКРК
з 27-IX па 5-X г. г. праводзіць
ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЮ КААПАКТЫВУ ГОРАДУ.
У выпадку неперарэгістрацыі ў паказаны тэрмін, калектывы будуць пазбаўлены права чарговасьці на атрыманьне дроў.
Кіравацца разасланай інструкцыяй.
ПРАЎЛЕНЬНЕ.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і Вышэйшы Пэдінстытут
абвяшчаюць усім уноў залічаным студэнтам (асеньняга прыёму), што
ЗАНЯТКІ
ў БДУ і Пэдінстытуце для іх
пачнуцца з 1-га кастрычніка,
а таму ўсе яны павінны да гэтага часу быць у Менску, пры чым паведамляецца, што ўсе тыя студэнты стыпэндыяты, якія будуць зьмешчаны ў інтэрнатах, павінны мець свае пасьцельныя прылады (падушку, цюфяк і коўдру).
Незьявіўшыяся для заняткаў у тэрмін будуць выключаны з ліку студэнтаў БДУ і Пэдінстытуту.
ЧВП Рэктара БДУ і Дырэктар Вышэйшага Пэдінстытуту Рудніцкі.

Усесаюзнае Аб'яднаньне Дзяржаўнай Мясной Прамысловасьці
„САЮЗМЯСА“
(Москва, Рождественская, 21)
АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на КУРСЫ
па падрыхтоўцы
старшых бухгальтароў і бухгальтароў-інструктароў для сыстэмы «Саюзмяса».
На курсы прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 25 да 50 год, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку ня ніжэй 7-мігодкі, стаж рахунковай працы не менш 5 год прычым апошнія 3 гады на пасадзе ст. рахункавода або памбуха.
Курсы 6-месячныя. Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам, вучэбнымі падручнікамі і стыпэндыяй у разьмеры 200 р. у м-ц, прымацоўваюцца да закрытай сталоўкі і атрымліваюць заборныя кніжкі і г. д.
Пры залічэньні на курсы слухачы даюць абавязацельства прапрацаваць у сыстэме „Саюзмяса“ па сканчэньні курсаў ня менш 2-х год.
Для залічэньня на курсы патрабуюцца наступныя дакуманты: 1. камандыровачнае пасьведчаньне на курсы ад адпаведнай рэспубліканскай або краявой к-ры „Саюзмяса“; 2. пасьведчаньне аб сканчэньні 7-годкі; 3. працоўны сьпіс; 4. спраўка аб чысткі савапарату; 5. спраўка аб непазбаўленьні выбарчых правоў; 6. характарыстыка ад мясцкому, а для партыйцаў і камсамольцаў—ад ячэйкі; 7. водзыў кваліфікацыйнай камісіі мясцовага ОРТ; 8. спраўка—аб стане здароўя.
Адбор камандыраваных на курсы з Беларусі праводзіцца Беларускай Рэспубліканскай к-рай „Саюзмяса“ (Белмяса) гор. Менск, пляц Волі, 7. Усе пералічаныя дакуманты накіроўваць на разгляд Белмяса. Аб тэрміне выезду на курсы будзе паведамлена. Пры выездзе на курсы патрабуецца таксама спраўка аб зьняцьці са снабжэньня па месцы жыхарства.
„Белмяса“

ПРАЦЯГ
пасяджэньня прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР
АДБУДЗЕЦЦА СЁНЬНЯ, 27 ВЕРАСЬНЯ, У 7 Г. ВЕЧ.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК абавязкова.
Просьба зьявіцца без спазьненьня.
Запрашаецца актыў.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

Сьмілавіцкі нова-адкрываемы с.-г. тэхнікум буйнай рагатай жывёлы і малочнай прамысловасьці
абвяшчае прыем на 1-шы курс.
Тэрмін навучаньня 2 з пол. гады
Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годку або маючыя падрыхтоўку ў абхваце 7-годкі. Могуць быць прыняты асобы з ведамі ніжэй 7-годкі, як я маюць практычны вопыт работы па жывёлагадоўлі і в ды ў аб'еме ня менш 6 груп.
Заявы накіроўваць: м. Сьмілавічы, Пухавіцкі р-н. памяшк. б. РВК, с.-г. тэхнікуму. Дакуманты, згодна даведніку НКА, як і для іншых тэхнікумаў.
Залічаныя ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам і 50 проц. слухачоў—стыпэндыяй.
Заявы прымаюцца да 25 кастрычніка.
Дырэкцыя тэхнікуму.

Беларускі геолёга-разьведачны трэст
„БЕЛГЕАЛРАЗЬВЕДКА“
ЗАПРАШАЕ
асоб скончыўшых Бел. сельска-гаспадарчую акадэмію і прыродазнаўчае аддзяленьне БДУ
для пасылкі ў Ленінградзкі і Маскоўскі геалёга-разьведачныя інстытуты
для перакваліфікацыі па спэцыяльнасьцях: інжынэраў-геалёгаў, геалёгаў-эканамістаў, інжынэраў-разьведчыкаў, гідрагеалёгаў, геафізыкаў, а таксама для пасылкі ў Акадэмію Навук СССР па спэцыяльнасьцях сапропеляведаў.
Заявы накіроўваць у сэктар кадраў Белгеалразьведка, Менск, пляц Волі, 21 1, ВСНГ БССР.

Да ведама ўсіх студэнтаў
Мар'іна-Горскага тэхнікуму.
У гэтым навучальным годзе заняткі ў тэхнікуме пачынаюцца ў наступным парадку:
нова-прынятыя студэнты зьяўляюцца ў тэхнікум 5-Х г. г.,
студэнты груп „С“—1-XII г. г.,
студэнты II-га курсу тэхперапрацоўкі пачынаюць заняткі з 15-XI г. г.,
усе іншыя, якія працуюць на вытворчай практыцы павінны зьявіцца 10-Х г. г.
Лідеры пасылаць для адтэрміноўкі ў тэхнікум.
Дырэкцыя.

ПАПРАЎКА.
У абвестцы Бел. Дзярж. будаўнічага Інстытуту („Зьвязда“ №№ 260 і 261) памылкова надрукавана: „...30 верасьня ў 6 гадз. раніцы...“ Трэба чытаць: „30 верасьня ў 10 гадз. раніцы...“

МЕНСКІ ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ІНСТЫТУТ
АБВЯШЧАЕ, што студэнты 1-га патоку, пераведзеныя з Горак, 1-га кастрычніка канчаюць вытворчую практыку і пасьля 15-дзённага адпачынку павінны зьявіцца ў інстытут 16-га кастрычніка для тэарэтычных заняткаў.
Студэнты 2-га патоку, пераведзеныя з Горак, канчаюць адпачынак 30-га верасьня і прыступаюць да тэарэтычных заняткаў 1-га кастрычніка.
ДЫРЭКЦЫЯ

28-га верасьня г. г., у 7 гадз. у Доме Камасьветы адбудзецца
вялікі масавы вечар,
прысьвечаны 2500-му нумару газ. „Акцябр“.
ПРАГРАМА ВЕЧАРУ:
1. Прывітаньні і рапарты.
2. Даклад—„Акцябр“ у рэканструкцыйным пэрыядзе. (Дакладчык—адказны рэдактар газэты „Акцябр“ т. ДУНЕЦ).
3. Літаратурная частка.
4. Канцэрт.
Білеты на прадпрыемствах.

Нарада замежных рабочых і палітэмігрантаў.
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР'у і ГАРПРАФСАВЕТ
СКЛІКАЮЦЬ
на 28 верасьня, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні ЦК МОПР БССР (Савецкая, 87)
экстрэнную нараду замежных рабочых і палітэмігрантаў, якія жывуць у гор. Менску.
З прычыны важнасьці пытаньня, яўка ўсіх абавязкова.
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР'у
Менскі Гарпрафсавет

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ДА ДНЯ ЎДАРНІКА І САЦСПАБОРНІЦТВА.

1. Ленін.—Аб электрыфікацыі. Ц. 10 к.
2. Сталін.—Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва. Ц. 3 к.
3. Сталін, Молатаў—Задачы вялікіх работ. Ц. 20 к. І Орджанікідзе.
4. АППА ЦК УсеКП(б).—Аб працоўнай дысцыпліне. Цана 20 к.
5. Молатаў.—Народна-гаспадарчы плян на 1931 год. Ц. 15 к.
6. Галадзед.—Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 год. Ц. 20 к.
7. Галадзед.—Барацьба за індустрыялізацыю і калектывізацыю БССР. Ц. 30 к.
8. Косераў.—За бальшавіцкія тэмпы плюс якасьць. Ц. 35 к.
9. Грыневіч.—У барацьбе за трэці рашаючы. Ц. 25 к.
10. Васкабойнікаў—На барацьбу за прамі Курціп. фінплян. Ц. 20 к.
11. Рыхтэр.—Як арганізаваць улік ударніцтва і сацспаборніцтва. Ц. 30 к.
12. Савічаў.—Як арганізаваць ударныя брыгады. Ц. 20 к.
13. Савічаў.—Пад сьцягам ударніцтва. Ц. 32 к.
14. Савічаў.—Хто заваюе пяршынства. Ц. 5 к.
15. Амосаў.—Транспарт—на рэйкі ўдарніцтва. Ц. 10 к.
16. Жалезнаў.—Брыгада на гаспадарчым разьліку. Ц. 10 к.
17. Садоўскі.—10 дзён, якія прынесьлі перамогу цэхам. Ц. 13 к.
18. Садоўскі.—Рукамі ўдарнікаў. Ц. 25 к.
19. Паўлаў.—За сацыялістычную арганізацыю працы. Ц. 35 к.
20. Рыкін.—На змаганьне за якасьць прадукцыі. Ц. 15 к.
21. Булах.—Год вялікага пералому і вытворчага энтузіязму. Ц. 15 к.
22. Логінаў.—Дагнаць і перагнаць. Ц. 25 к.
23. Садоўскі.—У барацьбе за паліва. Цана 10 к.
24. Малашэнка І—Новы цэх варашылаў. Лейбман. Ц. 7 к.
25. Северны.—У баёх за паказальны цэх харчаваньня. Ц. 10 к.
26. Обухаў.—За працоўную дысцыпліну на транспарце. Ц. 35 к.
27. Фрыд, інж.—Гутаркі аб рацыяналізацыі. Вып. І, ІІ, ІІІ і IV. Ц. 10 к. за кожны выпуск.
28. Магід А. І—Энтузіясты прылаўку
Броўштэйн В. (Практыка ўдарніцтва ў Ленінградзкай кааперацыі). Ц. 15 к.
29. Розэнберг С.—Энтузіясты працы. Цана 15 к.
30. Удалаў В.—Вытворчыя нарады ў калгасах. Ц. 15 к.
31. Бажанава З.—Новае ў рабоце вытворчых нарад. Ц. 20 к.
32. Броўцэнка Г.—Новыя шляхі вытворчых нарад. Ц. 10 к.
33. Даніловіч Г., інж. — Рацыяналізацыя і змаганьне са стратамі на вытворчасьці. (Гутаркі па рацыяналізацыі). Ц. 30 к.
34. Даніловіч Г., інж.—Дапаможнік брыгадзіру. Ц. 25 к.
35. Кауфман.—Рушыць наперад лёгкую прамысловасьць. Ц. 20 к.
36. Гілінскі.—Партгрупа па гаспадарчым фронце. Ц. 20 к.
37. Лісоў.—Партработа ў цэху. Ц. 20 к.
38. Шыбанаў.—Прэч прагулы. Ц. 15 к.
39. Раманаў.—Чаму і як трэба ўзьнімаць прадукцыйнасьць працы. Ц. 15 к.
40. Робінаў.—Што такое стандартызацыя. Ц. 20 к.
41. Зьвездзіч.—У паход за сілас. Цана 15 к.
42. Іокраў.—Выконваем пляны па сілосе. Ц. 10 к.
43. Лао.—У паход за эканомію апалу. Ц. 11 к.
44. Сукала.—Лесасплаў у сацыялістычным будаўніцтве. Ц. 10 к.
45. Гольдбэрг.—На рыштаваньнях. Цана 45 к.
46. Жук.—Турбіны гудуць. Ц. 15 к.
47. Знаёмы.—За дамбаю. Ц. 40 к.
48. Лясновы.—Крок пяцігодкі. Ц. 36 к.
49. Мінуліч.—Удар. Ц. 70 к.
50. Паоьлядовіч.—Людзі вясны. Ц. 40 к.
51. Скрыган.—Шугае сонца. Ц. 60 к.
52. Стафэўскі.—Гаворыць Асінстан. Цана 50к.
53. Клімчук.—Энтузіясты. Ц. 60 к.
54. Галавач.—Спалох на загонах. Цана 75 к.
55. Броўка.—Цэхавыя будні. Ц. 60 к.
56. Ліхадзіеўскі.—Рокаты дальняй прыстані.
57. Рагіта.—Я агітую за пяцігодку.

Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажыўкааперацыі і Саюздруку.

Менск, друкарня «Зьвязды»